незалежная газета

№ 4 (602) 28 студзеня 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

П е р ш а я   б е л а р у с к а я   г а з е т а

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Беларускі гурт паедзе на Еўрабачанне ад Польшчы?**

Старонка 2

**«Вас прызналі нявольнікамі...»**

Старонка 8



**Калі ўсе ведаюць, што я гей**

Старонка 9

## У НУМАРЫ

**Беларуская трагедыя**

Беларусь трымае першае месца ў свеце па колькасці арыштаваных менеджэраў. Новы затрыманы: дырэктар ААТ «Забудова». **Старонка 5.**

**Цэны на нерухомасць паплылі**

Зніжэнне цэнаў прапановы складае 10—12% проці вясны 2008 году, а цэнаў продажу яшчэ больш, бо лічба продажаў упала ў 3—4 разы. **Старонка 4.**

**Саміт Ючшанка-Лукашэнка: старт для Вышаградскай групы 2.0?**

Момант удалы, сур’ёзнасць можна будзе ацаніць па вырашэнні застарэлай праблемы міждзяржаўнага доўгу. Піша Дзяніс Мельянцоў. **Старонка 5.**

**Атамныя войны між Літвой і Беларуссю**

**Старонка 6.**

**Ці трэба ратаваць рэжым?**

Кажуць, «пакуль тоўсты ссохне, дык худы здохне». Трыбуна палітыка — піша Лявон Баршчэўскі. **Старонка 12.**

**У войску з’явіцца шведскі стол**

А вось пераходу да прафесійнай арміі не плануецца. **Старонка 6.**

**Драматычная сітуацыя з беларускамоўным школьніцтвам**

Доля школьнікаў, што навучаюцца па-беларуску, скарацілася на 2% за год. У першыя класы па-беларуску пайшло вучыцца толькі 16,7% школьнікаў. **Старонка 7.**

**Бацька дзяржаўнасці**

Антон Луцкевіч: калі б не ён і жменька ягоных паплечнікаў, Беларусь не стала б дзяржавай. **Старонка 13.**

# Быў ЕГУ беларускі

Цяпер яго хочуць ператварыць у «рэгіянальны». **Старонка 3.**



BELEHULT

# Якія 100 мільярдаў, спадар Лукашэнка?

**Беларусь прасіла ў Расіі пазычыць яшчэ $3 мільярды — на пераход у разліках на расійскія рублі. Масква не дала.**

«Мы нават не разглядаем» просьбу Беларусі аб выдзяленні крэдыту 100 млрд расійскіх рублёў (каля $3 млрд) у абмен на пераход на разлікі ў рублях ва ўзаемным гандлі, заявіў 24 студзеня журналістам намеснік міністра фінансаў РФ Дзмітрый Панкін.

«У іх былі ў лістах лічбы — 100 мільярдаў рублёў, мы гэта нават не разглядаем», — прывяло ягоныя словы агенцтва РІА «Новосці».

На пачатку мінулага году Расія выдала Беларусі $1,5 млрд у крэдыт. У канцы году — яшчэ адзін стабілізацыйны крэдыт, ужо $2 мільярды. Першую траншу яго Беларусь атрымала ў лістападзе, другая мае прыйсці ў лютым, пры ўмове, што Беларусь падпіша мемарандум аб эканамічных прэферэнцыях для Расіі на беларускім рынку, афармленых як «план сумесных дзеянняў дзвюх краін па пераадоленні наступстваў сусветнага фінансавага крызісу».

Цяпер ідзе ўзгадненне гэтага дакументу, што мае быць падпісаны ці ў канцы студзеня ці на пачатку лютага на сустрэчы высокага ўзроўню.

Дзяржаўны крэдыт выдадзены Беларусі на 15 гадоў паводле стаўкі LIBOR (сярэднесусветная стаўка) плюс 3% гадавых з адтэрміноўкай выплаты асноўнага доўгу на пяць гадоў. Гэта даволі нявыгадныя ўмовы, але, мусіць, мінскі ўрад вымушаны быў іх прыняць.

Мінулагодні крэдыт выдаваўся таксама на 15 гадоў пад стаўку LIBOR, але плюс усяго толькі 0,75% гадавых. Асноўны цяжар выплаты прыпадзе, такім чынам, на пасля 2013 году.

Чаму Расія не дае яшчэ адзін крэдыт? Папершае, Беларусь застаецца адной з нешматлікіх краінаў Еўропы з негатыўным крэдытным рэйтынгам, і Масква бачыць рызыкоўнасць гэтых укладанняў. Зрэшты, крэдыты Масквы Беларусі раней дыктаваліся палітычнымі, а не эканамічнымі меркаваннямі, і тут уваходзіць фактар непрызнання Беларуссю Абхазіі і Асеціі і г.д. Немалаважна і тое, што эканамічная сітуацыя самой Расіі ахавая. Эканамічны рост спыніўся з падзеннем цэнаў на паліва, а золатавалютныя запасы зменшыліся ажно на $200 млрд, ці то адну траціну, усяго за паўгоду. Калі цяперашняе становішча на сусветным рынку затрымаецца яшчэ на год, Расія сама можа пайсці з працягнутай рукой.

**Мікола Бугай**

# Беларускамоўны гурт паедзе на «Еўрабачанне» ад Польшчы?

Dali трапілі ў фінал польскага «Еўрафэсту».

Віктар Рудэнка з гуртам Dali тройчы намагаліся трапіць на фестываль «Еўрабачанне» ад Беларусі. Але далей за паўфінал іх не пускалі. Яны граюць узорны еўрапейскі поп-рок, да разумення якога кіраўнікі беларускага адбору ды журы, відаць, яшчэ не саспелі. Іх песні на англа-беларускамоўнай мяшанцы ім падаваліся то надта складанымі, то не хітовымі, то яшчэ што-небудзь. Дарэчы, менавіта Рудэнка напісаў песню «Шпацыруем», якую сёлета ў фінале «Еўрафэсту» спявалі яшчэ адны прадстаўнікі зусім іншай беларускай попмузыкі — гурт «Вецер у галаве».

Ідэі паехаць на «Еўрабачанне» Dali не кінулі ды падалі заяву на польскі адбор з нязменнай англа-беларускамоўнай поп-песенькай. Тут ім пашэнціла болей — польскія музычныя крытыкі заўважылі іхні Every Day.

Яны трапілі ў тузін фіналістаў з 120 ахвочых.

У Польшчы гэты конкурс карыстаецца куды меншай папулярнасцю. Хоць часам дзякуючы скандалам увага да яго прыцягваецца ўсеагульная. Як Польшча ўступала ў Еўрасаюз, на польскім адборы перамог гурт Ich troje з адпаведнай песняй пра слушнасць еўрапейскага выбару. Дык потым высветлілася, што падчас фіналу SMS-галасы гледачоў толькі за іх і прымалі.

Як і ў Беларусі, польскі адбор на «Еўрабачанне» паказваюць у жывым эфіры Першага дзяржаўнага тэлеканалу.

Так што для Dali ужо вялікая прыемнасць выступіць ужывую на такую аўдыторыю. А калі яшчэ ўсе беларусы Польшчы прагаласуюць за іх, то ў нашага гурту ёсць усе шанцы паехаць на «Еўрабачанне» ў Маскву ад Польшчы. Вядома ж, калі галасы будуць прымаць не за аднаго ўдзельніка.

Польскі адбор адбудзецца 14 лютага.

Цікава, што ва ўмоўным пакуль інтэрнэт-галасаванні «Далі» ідуць трэцімі.

Будзе сімвалічна, калі беларускамоўны гурт упершыню трапіць на «Еўрабачанне».

Паслухаць конкурсную песню Every Day гурту Dali можна на dali.muz.by.

**Сяргей Будкін**





## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічаюць грошы на выхад газеты.

## Дзякуй

**Уладзіславу І., А.А., Настассі К., Мікалаю П., Васілю Р., М.Ж., Уладзіміру І., Валерыю Б., Любові Л., Юрыю Б., Юрыю Б., С.С., А.Л., Галіне Г.** з Віцебску.

**Уладзіміру Ш.** з Віцебскага раёну.

**Ніне А., Міхаілу Ш.** з Клімавіцкага раёну.

**А.А., Уладзіміру З., Я.С., Уладзіміру К.** з Пінскага раёну.

**Барысу Л., Наталлі І.** з Пухавіцкага раёну.

**Таццяне М., Максіму Т., Алесю Б., Анжаліцы К., Мікалаю Н., Лідзіі А., Сяргею С., Алене А., Уладзіміру А., Аляксандру Р.** з Баранавіцкага раёну.

**Івану Л.** з Вілейскага раёну.

**В.Б., Валерыю К.** з Полацку.

# Быў ЕГУ беларускім

А зараз можа быць ператвораны ў «рэгіянальны».

Еўрапейскі гуманітарны універсітэт з беларускай ВНУ на выгнанні мае шанцы пераўтварыцца ў рэгіянальны Усходнееўрапейскі універсітэт, на ўзор Цэнтральнаеўрапейскага, што дзейнічае ў Будапешце (CEU). Кіраўніцтва сцвярджае, што на трансфармацыі ЕГУ настойваюць замежныя партнёры навучальнай установы. Маўляў, існаванне беларускай ВНУ за мяжой — справа не танная, і рэсурсы скончыліся.

Што вядома? Прынятае рашэнне пра скасаванне факультэтаў. Найхутчэй, пачнуцца скарачэнні па навучальных дысцыплінах і спецыяльнасцях. Ходзяць чуткі, што сярод першых кандыдатаў на вылет — спецыяльнасці беларусістыкі. Хоць рэктар ЕГУ Анатоль Міхайлаў сцвярджае, што рашэнне будзе залежаць ад якасці праграм.

Паводле Міхайлава, галоўная задача ЕГУ у найбліжэйшы перыяд — выйсці на самаакупнасць. Стаць «моцнай прывабнай адукацыйнай структурай». Цягам пятнаццаціхвіліннай размовы рэктар паўтарыў гэты выраз як мантру роўна пяць разоў.

ЕГУ быў зачынены ў Беларусі ў 2004 г. Ад 2005 году універсітэт дзейнічае за мяжой, у Літве. Напачатку моцную фінансавую падтрымку універу ў выгнанні далі Скандынавія і Фонд Сораса.

Навучанне вядзецца па бакалаўрскай і магістарскай ступенях, на вочнай і завочнай формах. Сярод спецыяльнасцяў, якія прапаноўвае ЕГУ: беларусістыка, паліталогія, еўрапейскія даследаванні, міжнароднае права, філасофія, медыі, камунікацыі, турызм.

* * *

Каб праясніць сітуацыю, мы звярнуліся да рэктара ВНУ акадэміка Анатоля Міхайлава.

**«Наша Ніва»: Што сёння адбываецца ў ЕГУ? Насамрэч чакаюцца рэвалюцыйныя рэформы?**

**Анатоль Міхайлаў:** Будзе рэформа нашай адукацыйнай праграмы, сістэмы кіравання, і я спадзяюся, што гэта пойдзе на карысць ЕГУ. Унутры ВНУ праходзіць інтэнсіўнае абмеркаванне ідэй з супрацоўнікамі. Быў зацверджаны пяцігадовы план развіцця ЕГУ, які трэба выконваць. Найбліжэйшым часам пройдзе паседжанне кіроўнай рады нашага універсітэту, у склад якой увакходзяць знаныя навукоўцы Еўропы і Амерыкі. Любыя канструктыўныя прапановы будуць вітацца.

**«НН»: Што ўключае ў сябе новы план стратэгічнага развіцця ЕГУ?**

**АМ:** Мы з'яўляемся структурай, якая павінна забяспечыць сваё якаснае існаванне. Нам трэба забяспечыць рэсурсы для развіцця ЕГУ. Урад Беларусі нам не дапамагае. Літоўскі ўрад робіць усё магчымае, але ён таксама не здольны цалкам забяспечыць наша існаванне. Нам трэба вызначыць стратэгію таго, як універсітэт пераўторыцца ў моцную прывабную адукацыйную структуру, якая будзе дзейнічаць для карысці і Беларусі, і Літвы. Гэта нялёгкая справа.

**«НН»: То бок на рэформе універсітэту настойваюць замежныя партнёры?**

**АМ:** У рэформе і трансфармацыях няма нічога драматычнага і негатыўнага. Рэфармаванне гэта нармальны працэс.



Любая структура, якая хоча выжыць у гэтым свеце, павінна быць гатовая да больш і больш адэкватных трансфармацый.

**«НН»: Вы можаце назваць канкрэтныя крокі па рэфармаванні ЕГУ?**

**АМ:** Найперш будзе дэмакратызаваная сістэма кіравання. Упершыню будзем выбіраць сенат універсітэту. Мы спрабуем зрабіць нашы праграмы міждысцыплінарнымі, бо іх занадта многа і яны вельмі адрозныя. У нас існуюць праблемы наконт якаснай рэалізацыі гэтых праграм. Павінны быць знойдзеныя шляхі максімальнага выкарыстання тых рэсурсаў, якія маем. ЕГУ існуе ў якасці літоўскага універсітэту менш за чатыры гады — гэта мізэрны тэрмін для таго, каб універсітэт ператварыўся ў магутную структуру. Непачаты край работы.

**«НН»: Факультэты будуць скасаваныя?**

**АМ:** Усяго ва універсітэце семнаццаць праграм. Я не магу назваць ніводнай іншай ВНУ, дзе было б нешта падобнае. Гэта ненармальна. Нам трэба ў большай ступені адпавядаць тым выклікам, з якімі мы сутыкаемся ў нашай посттаталітарнай, постсавецкай рэальнасці. Мы збіраемся рэструктурызавацца ў адпаведнасці з тымі існымі ўзорамі, якія прынятыя ў свеце. Мы збіраемся зрабіць навучанне для бакалаўраў і магістраў. Нам не патрэбная такая колькасць кіраўнікоў праграм, дэканаў, якую маем сёння. ЕГУ вельмі маленькі камерны універсітэт. Калі б вы сказалі, дзе нам браць рэсурсы, то можна было б стварыць яшчэ пяць факультэтаў. Жывем у цяжкія часы.

**«НН»: Будуць скарачэнні спецыяльнасцей, людскіх кадраў?**

**АМ:** Трэба разумець, што фінансаванне ад замежных донараў не будзе вечным. Нам трэба самім станавіцца на ногі, а не займацца папрашайніцтвам.

**«НН»: Ці можна гаварыць пра тое, што з беларускага універсітэту на выгнанні ЕГУ можа пераўтварыцца ў рэгіянальны?**

**АМ:** Калі наша ВНУ вырасце ў статусе, то гэта прынясе ўсім толькі карысць. ЕГУ застанецца беларускім універсітэтам. Разам з тым, падобнае пераўтварэнне падвысіць і статус Беларусі як палітычнага гульца ў гэтым рэгіёне, праясніць ролю і месца Беларусі. Дай Бог нам здзейсніць гэтую задачу. Не бывае адукацыі і навукі, абмежаванай нацыянальнымі межамі. Будзем аб'ектыўнымі: інтарэс да Беларусі ў свеце падае. Сёння я раніцай слухаў Бі-бі-сі: там расказваюць пра Мугабэ, пра Блізкі Усход. Свет жыве іншымі рэаліямі.

**«НН»: Беларускамоўная адукацыя будзе скарочана?**

**АМ:** Гэта будзе залежаць ад якасці праграм.

**«НН»: Варыянт вяртання ЕГУ ў Беларусь на парадку дня не стаіць?**

**АМ:** Гэта абсурд — вяртацца для таго, каб нас зьнішчылі.

**Зміцер Панкавец**

**КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ**

### Закладнікі «якаснага існавання»

Вялікая страта для беларусаў, калі донары ЕГУ сапраўды не працуюць на стварэнне ўмоваў для вяртання ўстановы ў Беларусь, а навязваюць ператварэнне універсітэту ў аналаг CEU.

Многае ў любым разе залежыць ад самога калектыву. Якая галоўная мэта праекту? «Якаснае існаванне» ці паслядоўнае станаўленне незалежнага беларускага універсітэту — нават у муках, у вузейшым коле, пры «няякасным існаванні»? Што выбера ЕГУ?

У сухім астатку рыторыкі пра «рэгіянальны універсітэт» — старая як свет ідэя, каб беларусы «працавалі на дэмакратызацыю Расіі». Чым абяртаюцца такія задумы, бліскуча апісаў у сваёй гісторыі беларускіх марыянаў а.Аляксандр Надсан — якому, дарэчы, нядаўна быў нададзены тытул доктар ганорыс каўза ЕГУ.

Не на Усходнюю Еўропу ў выніку стане разлічаны той расійскамоўны універ. Бо Усходняя Еўропа паступова становіцца Цэнтральнай і не прымае расійскую мову як лінгва франка — а ЕГУ дагэтуль працуе пераважна па-расійску. На Расію перадусім будзе разлічаны. Так, еўрапеізацыя Расіі — сапраўды вялікі выклік для нас, еўрапейцаў. Толькі для грамадзянскае супольнасці і нацыянальнае ідэнтычнасці беларусаў на сёння найважнейшай задачай ёсць існаванне універу, арыентаванага на саму Беларусь.

Калі пераўтварэнне адбудзецца, беларусам трэ будзе працаваць на ўтварэнне Беларускага Свабоднага універсітэту. Тады Нацыянальны універсітэт паўстане ўнутры краіны, а не за яе межамі. На аснове «вечаровых універсітэтаў», знізу, або воляй аўтакрата, зверху.

# Шэйман — пасол па асаблівых даручэннях

Нарэшце праяснілася, што з былым кіраўніком Рады Бяспекі Віктарам Шэйманам. Пасля звальнення з пасады ў ліпені пра Шэймана не было нічога чуваць. Адзіны раз ён засвяціўся перад фотакамерай падчас сустрэчы ў аэрапорце «Мінск-2» венесуэльскага лідэра Уга Чавеса.

У сталіцы хадзіла мноства чутак пра далейшы лёс адыёзнага чыноўніка. Некаторыя казалі пра хатні арышт, іншыя — пра ўцёкі Шэймана з краіны.

Як паведаміў «Народнай волі» прэс-сакратар Рады Бяспекі Вікенцій Ключнік, Шэйман працуе на пасадзе пасла па асобых даручэннях. Рабочы кабінет знаходзіцца ў Адміністрацыі прэзідэнта на Карла Маркса, 38.

Нагадаем, што Віктар Шэйман з'яўляецца падазраваным у знікненні апанентаў улады. За гэта ён фігуруе ў спісах невыязных беларускіх чыноўнікаў у краіны Еўрасаюзу і ЗША. Пасады старшыні Рады Бяспекі пазбавіўся пасля выбуху ў Мінску на Дзень Рэспублікі. На адмысловай нарадзе па выбуху Лукашэнка заявіў Шэйману: «Вы вінаватыя».

**ЗП**



Цяпер Шэйман на задніх ролях.

# Трэба Рада? Будзе Рада

Пры Адміністрацыі прэзідэнта будзе створаная Грамадская рада па правах чалавека. Яна будзе мець дарадчы характар. Акрамя лукашэнкаўскіх работнікаў, у яе мяркуецца запрасіць прадстаўніка Беларускага Хельсінкскага камітэту. «Пакуль персанальны склад рады да канца не сфармаваны, ён будзе апублікаваны пазней. Аднак я магу сказаць, што ў яго павінны ўвайсці таксама прадстаўнікі палітычных партый, у тым ліку і апазіцыйных», — сказала Н.Пяткевіч. На думку аналітыкаў, гэта яшчэ адна мера з мэтай прадэманстраваць свету, якая ў Беларусі дэмакратызацыя. У той жа час ідэалагічная вертыкаль, што пільнуе інтарэсаў адной палітычнай групоўкі, застаецца ўсясільнай.

**МБ**

# Сітуацыя няпростая, але стабільная

упэўніваюць Кабякоў і Зайчанка.

Напачатку быў адзначаны станоўчы рост эканомікі краіны за 2008 год. Рост ВУП склаў 10%. Адмоўныя паказчыкі былі толькі па двух пунктах — імпарт і сальда.

«Натуральна, што рост эканомікі будзе замаруджаны ў сувязі з сусветным крызісам. Цяпер мы ацэньваем глыбіню. Найперш пралічваем нават не ўласныя магчымасці, а магчымасці нашых партнёраў. Праблемы заключаюцца не толькі ў падзенні попыту на прадукцыю, але ў змяншэнні цэнаў. З бытавога гледжання гэта добра, але не для тавараવытворцаў. Цяпер мы будзем вымушаныя прадаваць прадукцыю ніжэй за сабекошт. Гэта цяжка хаця б з псіхалагічнага пункту гледжання», — сказаў віцэ-прэм'ер.

У сувязі з дэвальвацыяй шмат хто павялічыў цэны на прадукцыю на 20% і больш.

Паводле Кабякова, прэзідыум ураду прыняў пастанову аб правядзенні праверак на цэнаўтварэнне, хаця ў краіне і быў абвешчаны паўгадавы мараторый на праверкі. Толькі ў Мінску было вынесена каля 50 адміністрацыйных папярэджанняў. «Некаторым трэба ўправіць мазгі», — рэзка зазначыў чыноўнік.

Ацэначная сярэдняя цана на газ для прамспажыўцоў у Беларусі складзе ў 2009 г. 175 даляраў. Пры гэтым сярэдняя ўваходная цана на мяжы Беларусі будзе 148 даляраў за тысячу кубаметраў.

Гэта даволі высокая, хоць і прадказальная лічба: сярэднегадавая цана для Украіны складзе 229 даляраў. Нагадаем, што летась Украіна плаціла 178, а Беларусь — 126 (119—128) даляраў.

Кабякоў адмовіўся назваць, якую канкрэтна цану Беларусь будзе плаціць у першым квартале гэтага году.

Міністр эканомікі Мікалай Зайчанка зазначыў, што інфляцыя стала больш хуткай. Інфляцыя ў студзені складзе арыенціровачна 3,5%. Разам з тым, уланы пакуль не пераглядаюць прагноз росту эканомікі на 11%, які быў запланаваны летась.

Андрэй Кабякоў заявіў, што масавых звальненняў на прадпрыемствах не будзе.

**Сярэдняя ўваходная цана на газ для Беларусі складзе 148 даляраў. Гэта найніжэй у Еўропе.**

Хаця пацвердзіў, што на шэрагу прадпрыемстваў ёсць праблемы з «няпоўнай занятасцю». Прэм'ер-міністр Сідорскі займае ў гэтым пытанні жорсткую пазіцыю, і кіраўнікі, якія злоўжываюць гэтай мерай, могуць быць звольненыя.

«Можа быць, мы пойдзем на шкоду прыбытку, але трэба падтрымліваць людзей», — гаворыць А.Кабякоў.

Таксама віцэ-прэм'ер паспрабаваў запэўніць, што атрымаецца захаваць сённяшні курс рубля.

**Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў.**

**За першыя 20 дзён году золатавалютныя рэзервы Беларусі скараціліся на $900 млн.**

Як паведаміў першы намеснік старшыні Нацбанку Павел Калавур, з улікам атрыманых міжнародных крэдытаў, «з пачатку студзеня ЗВР Беларусі скараціліся на $100 млн». Гэта прытым, што 14 студзеня Беларусь атрымала першы транш крэдыту МВФ памерам $788 млн, атрыманыя сродкі залічаныя ў склад золатавалютных рэзерваў краіны. Значыць, рэальнае скарачэнне склала каля $900 млн.

На 1 студзеня 2009 аб'ём ЗВР Беларусі складаў $3 млрд 61 млн супраць $4 млрд 182 млн на пачатак студзеня 2008, нягледзячы на атрыманне за год $2,5 млрд крэдыту ад Расіі.

## Тусоўка ў Давосе

Ніколі раней за тыя 38 гадоў, што палітычныя і бізнесовыя лідэры збіраюцца на швейцарскім лыжным курорце Давос, каб заводзіць кантакты і абмяркоўваць актуальныя пытанні, перспектывы сусветнай гаспадаркі не здаваліся такімі ахінутымі змрокам, ніколі раней не выклікала такіх сумневаў здольнасць капіталізму да самарэгуляцыі. Ніхто не можа гарантаваць, што выдзяленне амерыканскім урадам астранамічнай сумы 3 трыльёны даляраў на стымуляванне эканамічнага росту дасць вынік.

Напярэдадні Давосу Міжнародны валютны фонд чарговы раз знізіў свой прагноз эканамічнага росту ў свеце яшчэ на 1—1,5%. Чакаецца, што ВУП Германіі скароціцца на рэкордную за пасляваенны перыяд лічбу — 2%. Столькі сама страціць лакаматыў сусветнай гаспадаркі — амерыканская.

Расія трапіла ў стагнацыю, а Кітай запаволіў рост, што для яго, абцяжаранага ўнутранымі праблемамі, можа быць фатальна.

Пяцідзённая тусоўка ў Альпах збярэ 2500 удзельнікаў. Сёлета яна будзе сціплейшай. Менш будзе шыку, менш наваротаў — сесійныя пакоі не будуць надушваць эксклюзіўнымі парфумамі, адмысловымі для кожнае залі.

Тым не менш, Давос не танны. Гадавая карпаратыўная сяброўская плата, што дае права пасланць дырэктара ў Давос, складае 42 500 швейцарскіх франкаў ($36 768), плюс яшчэ 18 000 франкаў аплаты за ўдзел у форуме. І гэта без уліку кошту гатэлю і абедаў.

Сёлета ўпершыню на форум прыедзе прэм'ер-міністр Кітаю. Чакаюць у Давосе і Уладзіміра Пуціна. Будуць выступаць таксама Меркель, Браун і Аса.

**МБ**

## Цэны на нерухомасць паплылі

Сярэдняя цана прапановы аднапакаёвак знізілася да 1910 даляраў за кв.м, а трохпакаёвак — да 1818 даляраў паводле рэйтынгу сайту realt.by на 23 студзеня. Але гэта прапанова — цана продажаў упала яшчэ больш. Каб прадаць кватэру, людзі робяць гіганцкія зніжкі. Гэта ўплыў крызісу — амаль усе беларускія банкі спынілі выдачу крэдытаў на набыццё і будаўніцтва жытла, а тыя, што па-ранейшаму выдаюць крэдыты, — абмежавалі сумы і ўзнялі працэнты.

Імаверна, гэта яшчэ не мяжа зніжэння цэнаў, бо на паралельных рынках, напрыклад, у Кіеве, цэны ўпалі на 50—80%.

Гэтак што людзі з грашыма могуць выкарыстаць крызіс для выгадных гешэфтаў.

**Мікола Бугай**

**Зніжэнне цэнаў прапановы складае 10—12% проці вясны 2008 году, а цэнаў продажу яшчэ больш, бо лічба ўгодаў упала ў 3—4 разы.**

## СЦІСЛА

### Разборкі на Малінаўцы

Каля сотні прадпрымальнікаў сабраліся на стыхійны мітынг ля адміністрацыі «Цэнтральнага аўтамабільнага рынку», што знаходзіцца ў Малінаўцы. Індывідуальныя прадпрымальнікі абураныя студзеньскім падвышэннем арэнднай аплаты на 50%.

### Эстонія плануе перайсці за год на еўра

Краіна мае намер падрыхтавацца да ўваходжання ў зону еўра да 2010 году. На сёння еўра ўведзены ў 16 краінах Еўрасаюзу. Апошняй 1 студзеня 2009 году да зоны еўра далучылася Славакія. Пра свае намеры ўвесці адзіную еўрапейскую валюту ў найбліжэйшыя тры гады заявілі Польшча, Латвія і Румынія.

### Балгарыя раздумвае над перазапускам АЭС

Парламент Балгарыі прагаласаваў за запуск двух рэактараў на АЭС у Казладуі, спыненых на патрабаванне ЕС. Ды расійскія рэактары тыпу ВВЭР-440 не адпавядаюць еўрапейскім нормам бяспекі. Вярнуць іх у працу хочуць пад уплывам шоку, выкліканага спыненнем паставак расійскага газу. Балгарыя была заключыла сепаратную дамову аб пастаўках газу з Расіяй. Гэта не ўратавала яе: яна найбольш пацярпела ад перакрыцця вентыляў.

**МБ; БелаПАН, mfront.net**

# Саміт Ючшанка-Лукашэнка: старт для Вышаградскай групы 2.0?

Момант удалы, сур’ёзнасць можна будзе ацаніць па вырашэнні застарэлай праблемы міждзяржаўнага доўгу. Піша **Дзяніс Мельянцоў**.

20 студзеня адбылася двухбаковая сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Украіны, якая планавалася яшчэ з 2007 году, але кожны раз адкладалася з розных прычынаў. Нягледзячы на тое, што падчас гэтае сустрэчы не ўдалося вырашыць усіх праблемаў беларуска-ўкраінскіх адносінаў, яна па праве можа лічыцца лёсавызначальнай для ўсёй Усходняй Еўропы.

Візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Чарнігаў стаў прарыўным не ў сэнсе дасягнутых пагадненняў, але ў сэнсе глыбокага сімвалізму і выразнасці «паслання», у прыватнасці, Крамлю.

*Па-першае*, гэты візіт рыхтаваўся два гады, і кожны раз яму заміналі розныя чыннікі, галоўным з якіх быў пат у вырашэнні праблемы ўкраінскага доўгу, праз якую немагчыма было канчаткова закрыць пытанне ўкраінска-беларускай мяжы. Аналітыкі падкрэслівалі, што візіт можа адбыцца толькі тады, калі будзе знойдзена рашэнне праблемы доўгу або калі ў бакоў з’явіцца палітычная воля заплюшчыць вочы на гэтае пытанне дзеля вырашэння стратэгічных праблемаў. Таму гэтая сустрэча гаворыць пра з’яўленне супольных праблем, якія каштуюць больш за стомільёнciv доўг.

*Па-другое*, сустрэча Ючшанкі і Лукашэнкі адбылася не ў адной са сталіц, а ў Чарнігаве, які размешчаны паміж Мінскам і Кіевам.

*Па-трэцяе*, сустрэча прайшла менавіта 20 студзеня, у дзень інаўгурацыі новага прэзідэнта ЗША. Такім чынам, змена адміністрацыі сімвалізуе і перамены ў рэгіянальнай палітыцы ва Усходняй Еўропе.

*Па-чацвёртае*, візіт адбыўся практычна адразу пасля завяршэння расійска-ўкраінскай газавай вайны, што падкрэслівае ягоную тэматыку і значнасць не толькі для Украіны і Беларусі.

Афіцыйная сустрэча двух лідэраў у Чарнігаве сталася завяршэннем даволі працяглага перыяду ў беларуска-ўкраінскіх адносінах, які распачаўся пасля «Памаранчавай рэвалюцыі» і характарызаваўся інтэнсіфікацыяй гандлю пры агульным нізкім узроўні палітычных кантактаў. На прасторы СНД Украіна і Беларусь займалі



супрацьлеглыя палітычныя пазіцыі, аднак на сёння супольныя выклікі прымушаюць Мінск і Кіеў шукаць шляхі каардынацыі сваёй палітыкі.

Сустрэча мела вынікам падпісанне цэлага пакету другасных дакументаў. Значнасць падпісаных дакументаў не патрабавала сустрэчы на найвышэйшым узроўні, тым больш што ані пытанне доўгу, ані пытанне мяжы вырашана не было. Сустрэча кіраўнікоў дзяржаваў была важнай сама па сабе, а не ад падпісаных пагадненняў.

Яна дала магчымасць пры зачыненых дзвярах абмеркаваць тыя пытанні, якія пакуль што рана выносіць на паперу, сярод якіх каардынацыя ў межах ініцыятывы «Усходняе партнёрства» ЕС, Балта-Чарнаморскі транспартны калідор і нафтапровад «Адэса-Броды».

Факт і змест сустрэчы Ючшанкі і Лукашэнкі ў Чарнігаве дазваляюць зрабіць шэраг высноваў, датычных развіцця ўсяго рэгіёну.

1. Беларусь **паслядоўна праводзіць палітыку выхаду з міжнароднай ізаляцыі**, у тым ліку і праз спробу прыняць удзел у пабудове рэгіянальнага інтэграцыйнага блоку, што падвысіла б яе значнасць як для Расіі, гэтак і для Захаду. Момант для гэтага выбраны ўдала: і агульная міжнародная сітуацыя, і сусветны эканамічны крызіс пашыраюць магчымасці для перафарматавання адносінаў у рэгіёне Усходняй Еўропы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дзейнічае такім чынам, каб прадэманстраваць сваю надзейнасць і дамоваздатнасць як у адносінах з Расіяй, гэтак і ў адносінах з Захадам і Украінай.

2. Палітычнае збліжэнне з Украінай з’яўляецца **часткай нармалізацыі адносінаў з Захадам**. Пры гэтым Украіна будзе адыгрываць ролю пасярэдніка ў дыялогу паміж Беларуссю з аднаго боку і ЕС і ЗША — з іншага.

3. Наладжванне кантактаў з Украінай сведчыць пра **спробы знайсці альтэрнатыўную ЕС і Расіі апору ў рэгіёне**. Пры гэтым сур’ёзнасць намераў усталяваць доўгатэрміновыя палітычныя адносіны з Украінай будуць вымярацца апаратыўнасцю вырашэння галоўнага пытання беларуска-ўкраінскіх дачыненняў — пра дзяржаўны доўг.

4. Распачынаецца праца ў кірунку **каардынацыі транзітнай палітыкі Беларусі і Украіны**, што ў перспектыве можа стаць магутным інструментам уплыву на палітыку Крамлю ў рэгіёне.

Пачатак абмеркавання супольных дзеянняў што да ўдзелу ва Усходнім партнёрстве ЕС і каардынацыі падыходаў Кіева і Мінску ў стасунках з Еўракамісіяй сведчаць пра **магчымасць нараджэння ва Усходняй Еўропе другога выдання Вышаградскай групы**, мэтай якой, нагадаю, была каардынацыя ўступлення ў Еўрапейскі саюз. Супольная палітыка Украіны і Беларусі што да ЕС падвысіла б геапалітычную вагу абедзвюх краін у вачах ЕС, а таксама паспрыяла б нармалізацыі стасункаў Беларусі з Бруселем з перспектывай перагляду стаўлення беларускіх уладаў да інтэграцыі краіны ў Еўрасаюз. Аднак, дзеля таго, каб «Вышаград 2.0» сапраўды паўстаў, **Беларусь мусіць выканаць сур’ёзную папярэднюю працу па лібералізацыі ўласнай эканомікі і палітычнай сістэмы**.

# Беларуская трагедыя

Затрыманы гендырэктар ААТ «Забудова» **Міхаіл Васіленка (на фота)**. Беларусь надзейна трымае першае месца па колькасці арыштаваных менеджэраў.

Міхаіла Васіленку падазраюць у атрыманні хабару 5000 даляраў. Пра арышт паведаміў намеснік генпракурора Беларусі Віктар Конан.

ААТ «Забудова» размешчана ў пасёлку Чысць Маладзечанскага раёну Мінскай вобласці. Гэта



гіганцкае прадпрыемства: на базе вытворчага комплексу ААТ «Забудова» дзейнічае домабудаўнічы камбінат, у склад якога ўваходзяць пяць прадпрыемстваў — завод будаўнічых канструкцый, дрэваапрацоўчы завод, заводы дахоўкі, сухіх сумесей і будматэрыялаў.

Зарплаты топ-менеджэраў аналагічных кампаніяў у Еўропе складаюць дзесяткі і сотні тысяч даляраў, бо такая пасада патрабуе выключнай кваліфікацыі, інтэлекту і менеджэрскіх здольнасцяў. А ў нас — маюць смешныя заробкі, спакушаюцца грашыма і даюць працы агентам і следчым.

Заганнае кола. Людзі, чый розум мог бы карміць тысячы, кормяцца са шконкі за грошы падаткаплатнікаў.

**Мікола Бугай**

## НАВІНЫ СЦІСЛА

### Лукашэнка: Не дай Бог, выявім дысертацыю, дзе пакладзены апісальны прынцып

«Няхай дактароў навук будуць дзесяткі, але толькі пры ўмове, што яны павінны пакласці на стол тое, за што заўтра возьмуцца работнікі вытворчасці.

Доктарская дысертацыя — гэта адкрыццё. Іншага падыходу быць не павінна. І не дай Бог, мы выявім хоць адну дысертацыю, дзе пакладзены апісальны прынцып. Такія навукоўцы са ступенямі нам не патрэбныя», — заявіў А.Лукашэнка на сустрэчы з навукоўцамі.

### Даляр дасягнуў 2700 рублёў

Паводле курсаў Нацбанку на аўторак, 27 студзеня, курс амерыканскага даляра ўстаноўлены ў памеры 2700 рублёў, еўра — 3495, расійскага рубля — 82. Попыт на валюту на БВФБ па-ранейшаму стала перавышае прапанову.

### Ушацкас рэкамендуе зблізіць Беларусь з ЕС

26 студзеня ў Брусселі на сустрэчы з кіраўніком еўрапейскай дыпламатыі Хаўерам Саланам міністр замежных справаў Літвы Вігаўдас Ушацкас абмеркаваў перспектывы адносінаў ЕС і Беларусі. Ушацкас паінфармаваў пра свой візіт у Мінск. Ён выказаўся за стварэнне магчымасці для збліжэння Беларусі з ЕС, што можа быць дасягнута з дапамогай палітыкі Усходняга партнёрства. Паводле Ушацкаса, збліжэнне паспрыяла б развіццю адкрытага грамадства, умацаванню павагі да прынцыпаў дэмакратыі, вяршэнства закону, а таксама пераходу Беларусі да свабоднага рынку.

### Няўрадавым арганізацыям дазволілі, а БХД — не

Асамблея няўрадавых арганізацыяў пройдзе 6—7 сакавіка ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры (ІВВ). 23 студзеня быў атрыманы станоўчы адказ на правядзенне мерапрыемства.

Цікава, што ў той самы дзень цэнтр ІВВ адмовіў аргкамітэту па стварэнні партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя ў прадстаўленні памяшкання для правядзення Устаноўчага з’езду 28 лютага.

### Галоўны ідэолаг Брэсту сустрэўся з праваабаронцам

У Брэсце з ініцыятывы кіраўніка ідэалагічнага аддзелу аблвыканкаму Аляксандра Рагачука адбылася яго сустрэча з праваабаронцам Уладзімірам Вялічкіным. «Ідэолаг распытваўся, ці можам мы супрацоўнічаць з уладай у пытаннях культуры, весці дыялог пра праблемы ў грамадскім жыцці, выхаванні моладзі», — кажа Вялічкін.

### У Гродне і Лідзе пачалася эпідэмія грыпу

Да гэтых гарадоў можа далучыцца Навагрудак. У вобласці на каранцін зачыніліся дзесяць школ.

У Гродне навучальны працэс спынілі дзве школы і адна гімназія. Эпідэмія грыпу аб’яўленая таксама ў Лідзе. Рост захворванняў зафіксаваны і ў Навагрудку. Пераважная большасць хворых – непаўналетнія. Усяго ў Гродзенскай вобласці на каранцін зачыніліся 10 школ.

**МБ, ЗП; радыё «Свабода», БелаПАН, БЕЛТА**

# У беларускім войску з'явіцца шведскі стол

**А вось скарачэння тэрміновай службы пакуль не плануецца. Як і пераходу да прафесійнага войска.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

«Ніводная кантрактная армія яшчэ не справілася ні з адной вайной. Заўсёды ў бітвах перамагаў народ, які прыходзіў з запасу», — заявіў прадстаўнік Генштабу Мінабароны палкоўнік Андрэй Мурашоў у часе online-канферэнцыі на сайце БЕЛТА. З яго словаў, пераход цалкам на кантрактную службу немэтазгодны і эканамічна не выгадны.

Не плануецца і скарачэння тэрміновай службы. Сёння ў беларускім войску служаць 18, 12 і 6 месяцаў.

Альтэрнатыўная служба будзе. Адпаведны праект распрацаваны Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, але пакуль не прыняты парламентам. Але закон гэты будзе па-за кампетэнцыяй Мінабароны, бо альтэрнатыўная служба па вызначэнні не з'яўляецца вайсковай.

**Мальцаў адмяніў адказнасць камандзіраў за злачынствы падначаленых. Дзякуючы гэтаму перасталі ўтойвацца факты злачынстваў, у тым ліку і дзедаўшчыны.**

«Дзедаўшчыну» ў войску, лічаць чыноўнікі, вынішчылі загадам міністра абароны. Некалькі гадоў таму Леанід Мальцаў падпісаў загад, які мусіў вырашыць пытанне дысцыпліны ў войску. Ён прадугледжваў скасаванне адказнасці камандзіраў за злачынствы падначаленых. Дзякуючы гэтаму камандзіры перасталі ўтойваць факты злачынстваў, здзейсненых падначаленымі, у тым ліку і выпадкі парушэння статутных узаемаадносін паміж вайскоўцамі. У выніку, падкрэсліў В. Раменчык, можна казаць пра выкараненне такой з'явы, як дзедаўшчына.

Прадстаўнікі Мінабароны запэўніваюць, што беларускія салдаты харчуюцца не горш за натаўскіх — у іх рацыён уваходзяць мяса, садавіна, гародніна, багатыя неабходнымі вітамінамі. А ў гэтым годзе будзе зладжаны эксперымент, у часе якога нашых вайскоўцаў будуць карміць паводле сістэмы «шведскі стол» — гэта калі чалавек сам можа выбіраць, што і колькі яму есці.

Палкоўнік Мурашоў распісаў справы ў войску ў найлепшым святле акурат напярэдадні прызыву. З 15 па 31 студзеня ў войска накіруецца каля 10 тысяч маладых людзей. Урачыстая прысяга ва Узброеных сілах адбудзецца 7 лютага.

**Сямён Печанко**

## З ВОДГУКАЎ НА САЙЦЕ NN.BY

Ясна, «пераход эканамічна не выгадны». Нічога таннейшага за рабоў, якіх пад прымусам у армію загналі, не знойдзеш.

**Алесь**

Садавіна і гародніна ў маёй частцы — гэта лыжка мяшанкі з паўгнілых салёных гуркоў і памідораў, дзе, праўда, было багата цыбулі. На тым вітаміны сканчаюцца. Мяса нам не давалі праз месяцы. Давалі варанае сала, кансервы рыбныя, ад якіх выпякала нутро. Раз–два на тыдзень давалі вараную рыбу (нячышчаную, з усімі кішкамі). Калі–нікалі ў пюрэ прасочваліся мясныя павуцінкі тушонкі. Сама бяда — што з меню практычна вынішчаныя зяленіва і малочныя прадукты. Садавіна — кампоцік з сушаных яблыкаў — часам з'яўляўся. 90% меню — крупы і пюрэ на вадзе. Творагу, сыру, садавіны ў маёй частцы я не бачыў. А шведскі стол — гэта гучыць горда!

**Багата хлусні...**

Прафесійная армія — тая, якая добра ведае сваю справу. Прызыў тут ні пры чым. Малая краіна можа абараніць сябе толькі ў выпадку, калі мае вялікі добра падрыхтаваны рэзерв. Сержанты і афіцэры і так павінны служыць па кантракце. А кожны здаровы грамадзянін павінен праходзіць службу па прызыве. Калі нам увогуле армія патрэбная, гэта прызыўная армія на фінскі, ізраільскі ці швейцарскі ўзор.

**Нацыяналіст**

Ага, абяцайце: на абед — шведскі стол, па абедзе — шведская сцяна, а ўночы — шведская сям'я. :)

**Швед**

Шведскі стол з ежай войска РБ — гэта здзеклівы выклік усім шведскім сталам свету.

**Шчыр**

# Атамныя войны між Літвой і Беларуссю?

**Літоўскія дыпламаты не разумеюць, чаму Беларусь дагэтуль афіцыйна не паінфармавала пра будоўлю АЭС. Літоўскія грамадзяне ў шоку ад ідэі ахаладжэння рэактараў вадою з Вяллі.**

Вестка пра будаўніцтва атамнай электрастанцыі выклікала шум не толькі ў беларускім грамадстве, але і сярод літоўцаў. На гэта ёсць падставы: астравецкая пляцоўка размяшчаецца ўсяго за 20 км ад мяжы і за 50 км ад Вільні. А рэактар пабудуюць на рацэ Вяллі, якая працякае праз галоўныя гарады – сталіцу, Коўна і Клайпеду.

Нягледзячы на тое, што віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка ўжо пацвердзіў выбар астравецкай пляцоўкі для АЭС, Літва дагэтуль не атрымала афіцыйнай заявы пра праект будаўніцтва і працягвае чакаць. У адрозненне ад беларускага ўраду, літоўскае кіраўніцтва, будучы не цалкам упэўненым у будаўніцтве двух рэактараў ля Ігналінскай электрастанцыі, ужо разаслала сваім суседзям інфармацыю з мэтай атрымаць ацэнкі і каментары.

Пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас пасля сустрэчы з прэзідэнтам Валдасам Адамкусам пацвердзіў, што афіцыйнай інфармацыі пра будаўніцтва АЭС няма: «Мы валодаем інфармацыяй са СМІ пра тое, што прынятае рашэнне будаваць атамную электрастанцыю ў Беларусі, аднак у гэтай краіне рашэнні пра будаўніцтва прымаюцца тады, калі прэзідэнт падпісвае дэкрэт. На дадзены момант такога дэкрэту няма».

Тое ж сцвярджае прадстаўнік Міністэрства навакольнага асяроддзя Віталіюс Аўгліс: «Афіцыйнай інфармацыі мы не маем, аднак Міністэрства прыродных рэсурсаў Беларусі ўлетку інфармавала міністра пра вядзенне навуковых даследаванняў магчымай пляцоўкі для будоўлі электрастанцыі». Прэм'ер-міністр Адрус Кубілюс, як вядома, засумняваўся ў праўдападобнасці планаў Беларусі, Польшчы, Эстоніі і Расіі будаваць атамныя станцыі недалёка ад Літвы, назваўшы іх «блефам».

Тым часам шараговыя грамадзяне незадаволеныя тактыкай адмоўчвання ўраду ў час, калі вырашаецца пытанне пра з'яўленне АЭС фактычна ля самай Вільні:

— «А чаго маўчыць наш урад? Грыбаўскайтэ (еўракамісар па фінансах – С.М.) сядзіць у Брусэлі і нічога не бачыць? Насамрэч гэта міжнародны скандал, наўпрост датычны Еўрасаюзу. Дык чаму такая сімуляцыя, такая цішыня?»

— «Мы ім рок-фестываль «be2gether» ля мяжы, а яны нам атамную станцыю таксама на мяжы»

— «Улада замест павышэння падаткаў мусіць найхутчэй дзейнічаць. Павінна ўмяшацца НАТО, а нам трэба прыпыніць усялякае супрацоўніцтва з беларусамі. Будзе вельмі цікава паглядзець, як адрэагуе літоўская дзяржава, — мусіць, ніяк».

Літоўцы трапятліва ставяцца да беларускай атамнай задумы не толькі з меркаванняў экалагічнай бяспекі, але і праз асаблівае стаўленне да астравецкіх земляў, якія лічацца сэрцам старажытнай Літвы. Сёння на гэтай тэрыторыі месціцца гервяцкі край — адна з самых буйных выспаў пражывання этнічных літоўцаў за межамі Літоўскай Рэспублікі.

Жыхары Гервятаў з трывогай ставяцца да будоўлі АЭС, бо гэта выклікае страх за дзяцей і здароўе. Пры гэтым і ў іх узнікае лагічнае пытанне, чаму ў Літве ніхто не супярэчыць таму, што беларусы збіраюцца скарыстоўваць ваду Вяллі для ахаладжвання атамных рэактараў.

Беларусы, у сваю чаргу, прад'яўляюць літоўцам прэтэнзіі праз аналагічны праект: будаўніцтва двух новых рэактараў узамен старых ля Ігналінскай АЭС, на возеры Дрысвяты. Але ж стары рэактар быў запушчаны ў 1984 г., яшчэ пры савецкіх уладах, а новы праект, калі ажыццявіцца, то будзе выконвацца еўрапейскімі спецыялістамі з улікам патрабаванняў бяспекі Еўрасаюзу.

**Стася Мініч, Вільня**

# Не кажы гоп

**На што разлічвалі ўлады год таму, і што выйшла ў эканоміцы? Памер золатавалютных рэзерваў, напрыклад, чакаўся на канец 2008 году на ўзроўні $5,5 млрд, атрымалі ж толькі 3 млрд. Піша Сямён Печанко.**

Згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год рост валавога ўнутранага прадукту павінен быў скласці 11%. Паводле афіцыйных звестак, па выніках году гэты паказчык апынуўся на 1% меншым — і ён яшчэ можа быць перагледжаны ў бок змяншэння, пасля таго як будуць дакладна вядомыя вынікі працы сельскай гаспадаркі ў 4-м квартале. Гэта ўсё адно вельмі высокія паказчыкі.

А вось з золатавалютнымі рэзервамі (ЗВР) — гарантыяй фінансавай стабільнасці — у краіне справы проста швах. На канец 2008 году паводле нацыянальнай методыкі яны прагназаваліся на ўзроўні $5,5 млрд. Больш за тое, атрыманне расійскага крэдыту ў канцы 2007-га дазволіла іх да гэтага ўзроўню давесці. Аднак рэальнасць парушыла гэтыя прагнозы — на 1 студзеня 2009 году ЗВР склалі ўсяго $3061,1 млн.

Гэта намнога менш, чым патрабуецца паводле міжнародных нарматываў: па ідэі, ЗВР павінны быць у памеры, дастатковым для выканання кароткатэрміновых фінансавых абавязкаў краіны па замежных і ўнутраных забавязаннях, плюс з розніку на аб'ём квартальнага імпарту. Для Беларусі гэта мусіла б быць на сёння, з улікам падзення аб'ёмаў імпарту, але імклівага росту замежнай запазычанасці, мінімум $8,5—9 млрд. Мусіла б...



Адмоўнае сальда замежнага гандлю прагназавалася ў памеры мінус $1,4 млрд, аднак па стане ўжо на студзень—лістапад 2008 году яго памер дасягнуў амаль 4 млрд.

**Інфляцыя планавалася ў межах 6–8%, аднак па выніках году перавысіла 13%.**

Менавіта неабходнасцю ратавання айчынных экспарцёраў абгрунтавалі ўлады надзвычай непапулярную меру — аднаразовую дэвальвацыю рубля, праведзеную акурат на навагоднія святы.

Інфляцыя планавалася ў межах 6—8%, аднак па выніках мінулага году яе памер больш чым удвая перавысіў мінімальны прагназаваны паказчык — 13,3%.

Стаўка рэфінансавання 17 снежня 2008 году ўзнялася да 12%, а з пачатку 2009 году да 14% супраць прагназаваных 7—9%.

Такім чынам Нацбанк спрабаваў ажывіць зацікаўленасць насельніцтва да банкаўскіх дэпазітаў. З гэтай жа прычыны выраслі і стаўкі гадавых па тэрміновых укладах. Згодна з планамі памер працэнтных ставак па крэдытах для нефінансавага сектару мусілі скласці 10—12% гадавых. Выйшла ж так, што працэнтныя стаўкі па крэдытах на нерухомасць выраслі ў сярэднім да 20—25%, на набыццё аўто — да 30%. Варта адзначыць, што большасць беларускіх банкаў увогуле прыпынілі на няпэўны час выдачу крэдытаў, таму крэдыты сталі недаступнымі.

Вось так не спраўдзіліся планы. Жангліраванне светлымі марамі ўвогуле характэрнае для савецкай сістэмы. Старэйшыя людзі добра памятаюць абяцанкі Хрушчова пабудаваць камунізм, Гарбачова — кожнай савецкай сям'і да 2000 году асобную кватэру. І дзе той камунізм, і дзе тыя кватэры?

# «Гэта смешна і нават небяспечна»

**Нямецкі палітолаг расійскага паходжання Аляксандр Рар апублікаваў артыкул у дзяржаўнай «Народнай газеце», у якім засцерагае ад утварэння Балта—Чарнаморскага саюзу.**

У артыкуле ён аналізуе пачаты працэс збліжэння Беларусі з Захадам. Ён вітае яго: «Не думаю, што Беларусь павінна цалкам капіяваць заходнюю сістэму, але было б слушным настройваць свае эліты і народ на тое, што дарога ў будучыню ляжыць праз еўрапеізацыю Беларусі, — піша ён. — Пры гэтым ні ў якім разе не мусіць быць адчужэння ад Расіі, усё-ткі Беларусь звязана з ёй многімі вякамі. Трэба спадзявацца, што Расія таксама будзе спрабаваць разам з усімі будаваць новую Еўропу».

Рар палічыў патрэбным акцэнтаваць увагу на пытаннях супрацы краінаў Балта-Чарнаморскага міжмор'я: «Што датычыць праектаў фармавання «саюзу краінаў-транзіцёрак», якія прапануюцца Беларусі, дык я хачу сказаць, што да гэтага Грузію і Украіну штурхаюць перадусім ЗША. Акрамя таго, за гэтым стаяць намеры польскіх палітыкаў стварыць блакаду вакол Расіі. Я думаю, што саюз транзіцёраў — гэта смешна і нават небяспечна».

Гэта не шкодзіць Рару пастуляваць, што «ЕС трэба любым коштам знайсці магчымасць закупляць газ і ў Цэнтральнай Азіі». А Беларусі што — тое хіба менш жыццёва? І якім чынам Беларусь можа таго дасягнуць, калі не праз супрацу ў Міжмор'і? Інакш можа скласціся сітуацыя, калі цэнтральнаазіяцкія рэсурсы цалкам адсмокча Заходняя Еўропа, а Усходняя застанецца прырэчанай на залежнасць ад «братняй Расіі».

Рар вядомы тым, што адлюстроўвае інтарэсы перадусім прагматычнага крыла расійскай бізнес-эліты і тых нямецкіх колаў, кшталту Шродэра, якія маюць інтэрас у Расіі. Як бачым, яны гатовыя прыняць пераарыентацыю Беларусі на Захад, але разглядаюць стварэнне саюзу краінаў Усходняй Еўропы як пагрозу сваім эканамічным інтарэсам.

**МБ**



# Драматычная сітуацыя з беларускамоўным школьніцтвам

**Доля школьнікаў, што навучаюцца па-беларуску, скарацілася на 2% за год. У першыя класы па-беларуску пайшло вучыцца толькі 16,7% школьнікаў.**

Па-беларуску сёлета навучаецца 18,4% ад агульнае лічбы школьнікаў. У першых класах сітуацыя яшчэ горшая: па-беларуску пайшлі вучыцца толькі 16,7%. Яшчэ ў 2006 годзе лічба беларускамоўных школьнікаў складала 22%. Прыкладна на гэтым узроўні — 22—25% — яна трымалася ўсе 2000—2006 гады. Дарэчы, столькі ж яна складала на 1985—1988 гады, да моманту, калі хваля нацыянальнага будаўніцтва прынесла перамены на карысць беларускай мовы, у выніку чаго ў 1994 годзе па-беларуску вучыліся ўжо 69% школьнікаў.

Запас інерцыйнай рэзістэнтнасці вычарпаўся, і 15 гадоў лукашэнкаўскай русіфікацыі зламалі нават той гнілы савецкі баланс.

Гэта небяспечны для мовы сімптом.

Старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў устрывожаны: «Працэсы змяншэння колькасці дзяцей, што навучаюцца па-беларуску, паскорыліся. Было па палове адсотка за год, а цяпер — амаль два адсоткі».

Рада ТБМ з гэтай нагоды адрасавала дзяржаўным органам і грамадзянскай супольнасці спецыяльную заяву. Пытанне стаіць ужо пра выжыванне беларускамоўнай сярэдняй адукацыі як такой.

Прычыны адкату беларускамоўнай сярэдняй адукацыі навідавоку. Куды ісці беларускамоўным школьнікам? Улады па-ранейшаму не дазваляюць утварэння беларускамоўнага універсітэту, ані дзяржаўнага ані тым больш прыватнага, каб трымаць мову ў межах гуманітарнае сферы. Гэта ў надбудове, а ў цокалі — брак беларускамоўных садкоў і сістэмы беларускамоўнага матэрыялу для дзяцей. Дзяржава не сфінансавала ніводнага (!) перакладу мультфільму на беларускую мову за доўгія гады. Калі раней у беларускамоўную школу прыходзілі пераважна дзеці з сем'яў, што не наведвалі садкоў, а гадаваліся ў бабцяў, цяпер такіх усё менш.

Фон — у краіне ўвогуле рэзка падае колькасць людзей, якія гавораць па-беларуску. Калі ў канцы XIX стагоддзя па-беларуску размаўляла абсалютная бальшыня насельніцтва, то на перапісе 1999 году 37% апытаных прызналіся, што карыстаюцца беларускай мовай як хатняй, а адпаведная лічба на перапісе 2009 году, напэўна, яшчэ радыкальней зменшыцца.

Беларуская мова праз 15 гадоў лукашэнкаўскага кіравання была выбарам смелых людзей.

Досыць сказаць, што сярод соцень генералаў і міністраў, дэпутатаў палатаў прадстаўнікоў не было ніводнага (!), хто б публічна размаўляў па-беларуску.

Калі ўзяць тую прэсу, замест якой цалкам ці больш чым на 50% беларускамоўны, яе агульны тыраж быў збіты з больш чым 1 700 000 экземпляраў у 1994 годзе да ўсяго 220 000 у 2009-м. Збіты часта рэпрэсіўнымі метадамі — зменай рэдактараў, статусу, а то і адкрытым закрыццём. Беларуская мова і яе носьбіты былі адсунутыя з тэлеканалаў. Абсяг вяшчання беларускамоўнага радыё «Сталіца» быў валюнтарысцкім чынам звужаны, а прыватная станцыя 101,2, прывабная для моладзі, зачыненая.

Высілкамі незалежнага грамадства будуюцца падмуркі новай культуры і навукі, але яны не здольныя вытрымаць штодзённы націск расейшчыны. ТВ «Белсат» не заменіць агульнадаступных каналаў, а незалежны кнігадрук (85% кніг выходзіць па-беларуску ў прыватных, часта нават падпольных выдавецтвах) даступны толькі малому колу людзей. Агулам у краіне па-беларуску выходзіць толькі 5,5% кніг.

Адзіным праменьчыкам аптымізму застаецца лічба школьнікаў, што вучацца па-беларуску ў гарадах.

Яна невялікая: 1,9%. Але ў савецкі час у абласных гарадах беларускамоўных школьнікаў не было зусім. Цяпер жа «малы статак» трымае нацыянальную традыцыю на сваіх плячах, нягледзячы на хмары і буры.

Актыўнасць гэтага кола, аднак, мае свае межы. Чым даўжэй пратрымаецца аўтакратыя, тым менш шанцаў на ўтрыманне мінімальнай крытычнай масы беларускамоўных. А без яе будучыня беларускай мовы змрачнее, бо не будзе з чаго прадукаваць жыццяздольныя беларускамоўныя асяродкі, у якіх мова можа функцыянаваць як жывая і з якіх пашырацца.

**Барыс Тумар**



# «Вас прызналі нявольнікамі...»

**Сумны досвед Алега, будаўніка з заходнебеларускага мястэчка, будзе карысны ўсім тым, каго беспрацоўе ці малы заробак гоняць па нялёгкія грошы на піцерскія ды маскоўскія будоўлі.**

«Добра з’ездзіў, чакаю, калі зноў патэлефануюць», — расказвае пра свае апошнія заробкі ў Расіі будаўнік Алег, чый працоўны стаж сягае за 30 гадоў. Гучыць нечакана, калі ўлічыць, што праз крызіс апошнім часам беларускія будаўнікі вяртаюцца з Расіі вымушана, часта без грошай.

«Я паехаў на прапанову праверанай фірмы, на якую працую не адзін год, таму падману не баяўся. Так яно і выйшла. Запрасілі вясной ізноў прыехаць», — кажа гастарбайтар. Апошнія ягоныя заробкі былі пад Піцерам, там ён кіраваў будаўнічай брыгадай.

Галоўнае, кажа Алег, працаваць сумленна, трымаць дысцыпліну. Як часта бывае? Прыедзе з якой Смаргоні дзядзька, прап’е грошы ў першы ж дзень, штраф атрымае, другі, а там і звольнілі. А дома пачынае скардзіцца — падманулі, на грошы «кінулі»! Алегу таксама даводзілася прымаць нялёгкае рашэнне, калі ў аднаго з падначаленых дайшло да запою. Затое ягоная брыгада здала ў тэрмін свой аб’ект, ды зарабіла добра. Ды тое добра было не заўсёды. Галоўны ўрок у сваім гастарбайтарскім досведзе Алег атрымаў пяць гадоў таму.

У невялікім мястэчку знайсці працу, дзе б добра плацілі, было складана, не дапамагаў і стаж. А трэ было будаваць сыну дом. Вось і паехаў будаўнік з былым калегам шукаць заробак у сталіцу. Па аб’яве ў газеце знайшлі фірму, якая займалася працаўладкаваннем на будоўлях Расіі. Падпісалі кантракт, паводле якога мусілі працаваць у катэджным пасёлку на ўскрайку Піцера. Там іх абяцалі пасяліць у адзін са збудаваных дамкоў.

У абавязкі наваспечаных гастарбайтараў уваходзіла ўсталяванне металадахоўкі на дахах катэджаў. Абяцалі афіцыйнае працаўладкаванне, рэгістрацыю, грошы немалыя, адпачынак. «Не бярыце шмат рэчаў, хіба толькі вялікі ручнік для лазні», — настойвала супрацоўніца фірмы, кажучы, што ўсё неабходнае дадуць на месцы. З яе словаў, першы заробак будаўнікі мусілі атрымаць ужо праз тыдзень, таму і грошай шмат браць не параіла. Знаёмячыся з кантрактам, Алег звярнуў увагу на адсутнасць пячаткі на дакуменце. «Я ж не магу з кожнай дамовай у Расію ездзіць», — патлумачыла жанчына ды паставіла пад дамовай пячатку сваёй фірмы.

На «Віцебскім» вакзале, як і абяцалі ў мінскім офісе, іх сустрэў Валер, чалавек ад фірмы. Паехалі засяляцца. Жытло апынулася занядбанай двухпакаёўкай у цэнтры гораду. Валер толькі адмахнуўся ад пытанняў пра катэдж на ўскраіне. У суседнім пакоі жылі шумныя чувашы, якія бесцырымонна знішчылі за вечар увесь запас харчоў, што прывезлі з сабой беларусы. Начаваць дзядзькам давялося на падазронай чысціні матрацах. На апошнія грошы набылі бялізну.

Наступнай неспадзяванкай стала ўласна праца. Назаўтра да беларусаў наведаўся іх новы начальнік, мужчына ўсходняга выгляду. Ён адвёз будаўнікоў на аб’ект, які аказаўся шматпавярховай забудовай. Начальнік і слухаць не стаў пра дахоўку ды катэджы. «Будзеце падземны гараж дабудоўваць», — загадаў ён ды паабяцаў добра заплаціць. Як пазней высветлілася, не дачакаўшыся грошай, той гараж кінулі рабіць будаўнікі са Слуцку.

Тэлефанаванне ў офіс піцерскай фірмы, каардынаты якой значыліся на кантракце, прынесла яшчэ адно адкрыццё: апошні раз з мінскімі калегамі піцерцы супрацоўнічалі два гады таму і з таго часу нікога да сябе не запрашалі. Зразумеўшы канчаткова, што іх падманулі, Алег патэлефанаваў у мінскую фірму, але там хутка кінулі слухаўку. Праз колькі дзён яму давялося сустракаць на вакзале чарговую партыю шчаслівых уладальнікаў вялікага ручніка для лазні. Расказаў землякам пра ашуканства. Параіліся, вырашылі шукаць іншую працу, каб зарабіць на зваротны шлях. Знайшлі яе ў той жа дзень, але, як аказалася, галоўныя праблемы іх толькі чакалі.

Новыя працадаўцы з першага погляду падаліся прыстойнымі людзьмі — далі працу, прытулак, дробныя грошы на харчаванне. Але тыдзень, на які дамаўляліся, расцягнуўся больш чым на месяц. Не паспявалі скончыць адну працу, як гаспадар угаворваў пачакаць з разлікам ды прапаноўваў новы аб’ект. Елі кефір з батонам. Урэшце пра даверлівых беларусаў проста «забылі». Але не забылі тыя — дачакаліся ўрэшце махляроў ды атрымалі свае «слёзы». У цягніку Алег схаваў рэшту заробку, але калегу зрабіць тое самае не ўгаварыў. У купэ завіталі расійскія міліцыянты, каб спраўдзіць наяўнасць рэгістрацыі, а замест яе знайшлі ў неабачлівага беларуса дзве тысячы рублёў, што засталіся ад трох заробленых.

У Мінску Алег запатрабаваў ад сваіх крыўдзіцеляў кампенсацыі за квіткі і аплату кантракту. Але яму заявілі, што насамрэч з працы іх звольнілі за грубае парушэнне дысцыпліны. Гэтыя словы па тэлефоне з Піцера пацвердзіў і Валер. Алег выклаў свае прэтэнзіі на паперы, павялічыўшы памер кампенсацыі на мільён рублёў ды паехаў дамоў чакаць адказу. Хутка са сталіцы патэлефанавалі, але гэтым разам з міліцыі. Следчы ў асабліва важных справах запрасіў падманутых будаўнікоў на гутарку. Пры сустрэчы паказаў раздрукоўку тэлефонных размоваў Алега з супрацоўніцай мінскай фірмы.

У рамках барацьбы з нелегальнай міграцыяй ды нявольніцтвам сталічная міліцыя выйшла на след злачыннай групоўкі, якая падманам выпраўляла на працу ў Расію суайчыннікаў. «Цяпер вамі займаецца Міжнародная арганізацыя па міграцыі пры ААН. Вас прызналі нявольнікамі», — паведаміў следчы будаўнікам. Гэты статус прадугледжвае медыцынскую ды юрыдычную дапамогу, а таксама аднаразовую грашовую кампенсацыю.

Мінула пяць гадоў. Гэтулькі ж правядзе за кратамі мінская махлярка. Алег чакае свайго мільёна ды не ведае, як ацаніць перажыванні сям’і, што больш за месяц не мела ад яго вестак. Няўдалая першая спроба не спыніла яго, але зрабіла асцярожным і больш абачлівым. Ён узгадвае ўзбека, які разам з імі патрапіў у кабалу пяць гадоў таму, — 19-цігадовы хлопец марыў зарабіць грошы, каб збудаваць мячэць ды вывучыцца на мулу. «Кожны мае свае мэты, калі едзе за свет зарабляць, — кажа Алег. — Але пры гэтым трэба быць падрыхтаваным да самых розных неспадзяванак».

**Сямён Печанко**

## СЦІСЛА

### Махляры прапаноўвалі крэдыты на жыллё

Брэсцкае абласное ўпраўленне КДБ і Упраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю затрымалі групу махляроў, што прапаноўвалі жыхарам гарадоў Беларусі платныя паслугі ў сферы крэдытавання. Затрыманыя 26-гадовая жыхарка Баранавічаў і 33-гадовы грамадзянін Украіны. Дзейнічалі зламыснікі ад імя няіснай арганізацыі з вясны мінулага году, за дапамогу ў «падборы варыянту беспрацэнтавага крэдытавання набыцця (будаўніцтва) жылля» бралі спачатку па 300 даляраў, а пад канец сваёй кіпучай дзейнасці — па 500 еўра. У дурнях апынуліся жыхары Мінску, Брэсту, Гродна, Магілёва, Баранавічаў, Ліды, Бабруйску ды іншых гарадоў.

### У Пружанах скралі камеру відэанагляду

Мясцовыя міліцыянты ўжо 1,5 месяца шукаюць невядомага злачынцу, які скраў камеру відэанагляду, усталяваную на сцяне будынку філіялу № 122 АСБ «Беларусбанк». Будынак банку знаходзіцца ў цэнтры гораду.

### Надта есці захацелася

Жыхар Гродна паспрабаваў арыгінальным чынам вырашыць пытанне асабістай харчовай бяспекі. Увечары ён завітаў у краму «Фенікс-Гродна» на вуліцы Дамбровскага. Спачатку ён паводзіў сябе як звычайны пакупнік — набраў харчоў амаль на 100 тысяч рублёў, адстаяў у чарзе. Але калі тая падышла, то малады чалавек кінуўся на выхад не разлічыўшыся. Ды на вуліцы яго чакала расчараванне ў выглядзе патруля міліцыі. Няўдаламу рабаўніку, а менавіта такі артыкул яму інкрымінавалі, пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

**СП**

# Калі ўсе ведаюць, што я гей

**Калі я прызнаўся ў сваёй арыентацыі, мне стала лягчэй, не трэба весці падвойнае жыццё. Але і крычаць пра гэта я не збіраюся, — кажа рэдактар сайту gay.by Аляксандр Палуян.**



Юлія Дарашкевіч

**Аляксандр Палуян**
нарадзіўся ў 1985 у Мазыры. Рэдактар сайту gay.by.

**Я ведаю не больш за пяць чалавек у нашай краіне, якія адкрыта прызнаюцца, што яны геі ці лесбіянкі, — кажа Аляксандр Палуян.**

Мазырскі ваенкамат некалькі тыдняў таму даў яму адтэрміноўку ад службы праз ягоную гомасексуальнасць. Гэта першы такі выпадак у Беларусі. Менавіта гэтая навіна і стала нагодай для гутаркі пра агульнае становішча секс-меншасцяў у Беларусі.

**Аляксандр Палуян:** Наша войска, як і грамадства, не гатовае прыняць геяў. Я б не змагаўся супраць прызыву, калі б ведаў, што да мяне там будзе нармальнае стаўленне. Але ўпэўнены, што ў войску будуць і здзекі, і жартачкі, тым больш цяпер, калі ўсе ведаюць, што я гей. Гэта фактычна падпісаны самому сабе прысуд.

**«Наша Ніва»: Як бы Вы ўвогуле ацанілі стан секс-меншасцяў у Беларусі на сёння?**

**АП:** Цяжкое становішча. Секс-меншасцяў не прымае ні грамадства, ні ўлада, ні апазіцыя. Знайсці тую групу людзей, якая б нармальна ставілася да геяў, лесбіянак і транссексуалаў, складана. Трэці сектар [незалежныя грамадскія арганізацыі — Рэд.] гатовы да супрацоўніцтва, улады маўчаць, некаторыя апазіцыянеры ж выказваюцца рэзка адмоўна. Адна толькі Партыя зялёных гатовая стварыць камітэт па абароне правоў секс-меншасцяў.

**«НН»: Калі параўноўваць з суседнімі дзяржавамі, то дзе становішча лепшае?**

**АП:** Калі параўноўваць з Расіяй, то там ціск з боку ўлады нават большы — забараняюць усё, ладзяць аблавы на забаўляльныя ўстановы, дзе збіраюцца гомасексуалы, не дазваляюць парады. Калі браць Украіну, то там сітуацыя больш-менш нармальная. Ствараюцца і рэгіструюцца арганізацыі, праводзяцца адукацыйныя і інфармацыйныя мерапрыемствы.

**«НН»: Што можа зрабіць дзяржава для паляпшэння ўмоваў жыцця гомасексуалістаў?**

**АП:** Проста адукоўваць людзей. Расказаць ім, які сапраўдны лад жыцця вядуць геі. Даваць людзям інфармацыю, хто такія геі. Трэба прымаць нейкія праграмы ў Міністэрстве адукацыі. У Беларусі ж цалкам адсутнічае сексуальнае выхаванне.

**«НН»: А гэта не будзе прапагандай гомасексуалізму?**

**АП:** Чаму прапагандай? Мы ж не кажам, што геем быць класна. Мы проста гаворым пра тое, што ёсць такія людзі і да іх патрэбнае гуманнае стаўленне.

**«НН»: Дык з якімі канкрэтнымі бытавымі праблемамі сутыкаюцца гомасексуалісты ў Беларусі?**

**АП:** Людзі робяцца закрытымі. Яны баяцца сказаць пра сваю гомасексуальнасць. Напрыклад, я ведаю не больш за пяць чалавек у нашай краіне, якія б адкрыта заявілі, што яны геі ці лесбіянкі. Транссексуалы ж цалкам мяняюць свой лад жыцця — яны мяняюць працу, кола знаёмых, пераязджаюць жыць на іншае месца. Калі прызнаешся некаму, што ты гей, то стаўленне людзей досыць неадэкватнае, а часам агрэсіўнае.

**«НН»: Дык наша грамадства гамафобскае?**

**АП:** Вось нядаўна радыё TUT.BY праводзіла апытанне на гэтую тэму. Дык большасць водгукаў, якія пайшлі ў эфір, былі кшталту таго, што кожны мае права на сваё прыватнае жыццё. Разам з тым, ёсць і іншыя моманты. Некаторыя кажуць, што мы хворыя. Працуе стэрэатыпнае мысленне. Людзі ведаюць, што гей — гэта кепска, а вось у нас ёсць традыцыйныя каштоўнасці. Дык, прабачце, мы не выступаем супраць гэтых каштоўнасцяў. Мы толькі кажам, што кожны чалавек мае права на свой лад жыцця і ўласную свабоду.

**«НН»: Дык а чаму грамадства не гатовае прыняць секс-меншасцяў?**

**АП:** Гэта мысленне навязвалася нам дзесяцігоддзямі. У людзей склаўся нейкі свой погляд на гэта, і яны нават не думаюць яго памяняць, разабрацца, хто такія геі.

**«НН»: Шмат хто кажа, што гомасексуалізм супярэчыць хрысціянскім каштоўнасцям. Што Вы можаце адказаць на гэта?**

> Геямі не становяцца, геямі нараджаюцца. Сексуальная цяга закладзеная прыродай і не залежыць ад чалавека.

**АП:** У нас шмат ідзе дыскусій па гэтым пытанні. Пачнем з таго, што Бог адзіны для ўсіх, і сярод вернікаў, упэўнены, таксама хапае гомасексуалаў. Проста казаць, што ўсе геі — садаміты, па меншай меры, некарэктна. Бог стварыў усіх, у тым ліку гомасексуалістаў. Мы не самі сябе прыдумалі, то бок немагчыма захацець пабыць геем, а потым зноў стаць гетэрасексуалам. Гэта прырода і не залежыць ад чалавека.

**«НН»: Дык значыць, геямі нараджаюцца, а не становяцца?**

**АП:** Я лічу, што нараджаюцца. Ну як ты станеш геем? Людзі з падлеткавага ўзросту (12—14 гадоў) пачынаюць задумвацца аб сваёй сексуальнай арыентацыі. Заўважаюць, што ім падабаюцца людзі таго ж полу. Паступова гэта развіваецца. Некаторыя прыходзяць да гэтага ў трыццаць гадоў. У іх могуць быць сям'я, дзеці, але яны прыходзяць да высновы, што гэта не іхняе. Кажуць, ёсць такая тэндэнцыя, што геем быць модна — глупства гэта. Няма нейкага стэрэатыпнага гея. Кожны індывідуальны. Апранаюцца, вядуць свой лад жыцця абсалютна па-рознаму.

**«НН»: А якія ўвогуле найбольш распаўсюджаныя стэрэатыпы пра гомасексуалістаў у нашым грамадстве?**

**АП:** У першую чаргу думаюць, што ўсе геі педафілы. Поўнае глупства. Нават паводле афіцыйнай статыстыкі колькасць педафілаў у працэнтных суадносінах сярод гетэрасексуалаў нашмат большая. Яшчэ лічаць, што геі падобныя да дзяўчат. Ведаеце, ёсць такія людзі, але іх адзінкі. А то часам паказваюць, што нейкі хлопец увесь у пёрах і ходзіць у такім выглядзе па вуліцах. Геі працуюць побач з вамі, карыстаюцца грамадскім транспартам. Яны такія самыя людзі, як і іншыя.

**«НН»: Колькі чалавек на сёння ўваходзіць у вашу арганізацыю?**

**АП:** Каля дваццаці. Зрэшты, наша арганізацыя досыць свабодная. Гэта ініцыятыўная група. Здараецца, што людзі прыходзяць ці сыходзяць, але цякучка вельмі невялікая. Ёсць касцяк, які абмяркоўвае, што зрабіць, куды з'ездзіць. Мы пачалі працаваць з людзьмі з Віцебску, Гомелю. Бо трэба, каб інфармацыю атрымлівалі не толькі ў Мінску.

**«НН»: Дык а які сёнňяшні сярэдні гей? Можаце адказаць?**

**АП:** Калі даваць агульную характарыстыку, то гэта досыць адукаваны, вольны чалавек, які любіць мастацтва.

**«НН»: Значыць, збольшага геі — творчыя асобы?**

**АП:** Ніхто не будзе адмаўляць, што шмат паэтаў, мастакоў (з вядомых — Чайкоўскі, Леанарда да Вінчы) былі геямі. У той жа час мы не ведаем, колькі геяў працуе, скажам, на МТЗ. Можа, там дакладна такая ж колькасць, як і сярод інтэлігенцыі. Паводле афіцыйнай статыстыкі, у свеце 5—10% працэнтаў гомасексуалістаў. Што да Беларусі, то некаторыя міжнародныя крыніцы даводзяць, што ў нас 70 тысяч геяў.

**«НН»: Што значыць у беларускім грамадстве адкрыта заявіць, што ты гей?**

**АП:** У некаторых узнікае неадэкватная рэакцыя. Я прызнаўся ў гэтым — адны асудзілі, іншыя сказалі, што малайчына: маўляў, не спалохаўся рэакцыі калег, сяброў, знаёмых. Калі ў мяне запытаюцца, ці гей я, адкажу, што так. Калі пытацца не будуць, то і крычаць пра гэта я не збіраюся. Калі я прызнаўся ў сваёй арыентацыі, мне стала лягчэй, не трэба весці нейкае падвойнае жыццё, як робяць многія. Гэта вельмі складана, бо людзі жывуць не сваім жыццём, а граюць ролі.

**«НН»: Калі Вы прыйшлі да ўсведамлення, што Вы гей?**

**АП:** У падлеткавым узросце. Заўважыў, што не звяртаю ўвагі на дзяўчат, а гляджу на хлопцаў. Гэта таксама было для мяне складана. Я не стаў з гэтым змагацца, як робяць некаторыя. Прырода ўсё адно возьме сваё. Як бы ты ні хацеў змяніць сябе, то ўсё адно не ўдасца. Я прыняў гэта як належнае.

**«НН»: Сябры, знаёмыя не адмовіліся ад кантактаў з Вамі?**

**АП:** Блізкія сябры і калегі ведаюць, што я гей. У прынцыпе, у нашых размовах мы імкнемся не закранаць гэтыя тэмы. Ну так, былі людзі, якія пісалі смс-кі, што яны не ведалі і гэта для іх вялікі сюрпрыз, але каб нехта адмовіўся, то такога няма.

**«НН»: А як бацькі паставіліся?**

**АП:** Яны не ведаюць. Хаця, можа, ужо і даведаліся, але ніякай рэакцыі не было.

**«НН»: Ці магчымы ў Беларусі гей-парад?**

**АП:** Ідэя ёсць. Але нават унутры нашай ініцыятывы да яе ставяцца па-рознаму. Грамадства не гатовае да гей-параду. Разам з тым, падобныя мерапрыемствы становяцца тым момантам, калі людзі даведваюцца пра геяў. Пачынаецца абмеркаванне тэмы. Усяму свой час, у нас гэты час яшчэ не прыйшоў.

**«НН»: А які сэнс увогуле ў гей-парадаў?**

**АП:** Людзі проста добра праводзяць час. Паказваюць сваю пазіцыю, заяўляюць аб правах. Кажуць, што роўныя з астатнімі. Нават тыя, хто ніколі не цікавіўся гэтай тэмай, пачынаюць самаадукоўвацца.

**«НН»: У Мінску ёсць месцы, дзе збіраюцца прадстаўнікі секс-меншасцяў?**

**АП:** Ёсць, як у кожнай іншай субгрупы, але я іх не назаву. Але такога адзінага месца, дзе мы збіраліся б увесь час, няма. Гэта проста небяспечна. У нас хапае гамафобаў, якія гатовыя на многае. На наш сайт досыць часта прыходзяць раз'юшаныя водгукі. Але фізічнай расправай не пагражалі.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

### Не змаглі перайсці Дняпро

31 цяля на бераг выгналі, а 16 найдурнейшых пайшлі пад лёд. Сумленныя людзі плачуць, а несумленныя маракуюць, на што тое мяса цяпер пусціць.

У Лоеўскім раёне, у вёсцы Перадзелка, прыйшлі бабы на ферму — а там цялят няма (47 галоў). Загарода паваленая, і пуста. Пабеглі шукаць па слядах — бачаць, яны на Дняпры, на лёдзе, за 2 км. А лёд тонкі. Выклікалі пажарнікаў. Дык 31 цяля тыя на бераг выгналі, а 16 найдурнейшых пайшлі пад лёд, дасталі іх трупы. Сумленныя людзі плачуць, а несумленныя маракуюць, на што тое мяса цяпер пусціць.

**Кацярына з-над Дняпра**

### Малявалі платы, а пасля перамалёўвалі

Хачу падзяліцца ўражаннямі з візіту Лукашэнкі ў Беразіно.

Наш раён лічыцца апошнім у вобласці па эканамічных паказчыках і першым па злачыннасці. Да прыезду Лукашэнкі фактычна толькі ў цэнтры былі роўныя ходнікі і больш-менш нармальная дарога. Але за два месяцы шмат што змянілася: па галоўнай вуліцы «хоць яйка качай», цэнтр адрамантаваны і падмаляваны. Горад папрыгажэў.

Не абышлося без маразмаў. У дождж малявалі платы і агароджы, якія пасля перамалёўвалі, у мароз людзей некалькі гадзін трымалі на плошчы, аж прыедзе шаноўны госць. Што казаць, увесь цэнтр перакрылі, і службоўцаў бяспекі было ці не болей за прысутных бярэзінцаў. Сама бачыла, як сабакі абнюхалі кожны люк на плошчы, а тады яшчэ і людзі пазазіралі туды. Бяспека ёсць бяспекай.

**Іна Амельчанка, Беразіно**

### Пра што нам пісаць?

Шаноўны рэдактар і супрацоўнікі «Нашай Нівы»! З вялікім задавальненнем чытаем газету. Чытаем газету ўсёй вёскай. Бо ў ёй — усё!

Цікавы рэпартаж з журавінавых балот в.Боркі Ганцавіцкага раёну. Шкада толькі, што адны і тыя ж асобы зафіксаваныя ў некалькіх кадрах. А гэты занятак — выжыць ва ўмовах лукашызму. Цікавыя старонкі «Люстра дзён». Паказвайце «сірым», як жывуць чыноўнікі, правадыры, іх сыны, чаму Коля не прымае парады беларускіх генералаў, дзе дзяваюцца грошы з замежных крэдытаў, як жыве першая ледзі, мама прэзідэнта, ці такія заробкі і пенсіі ў родных правадыра? Ці хутка скончыцца хлусня ў беларускіх СМІ? Дзе былыя саратнікі правадыра: Ціцянкоў, Антановіч, Віннікава, Шэйманы — і ўсіх ужо не прыпомніш.

Пытанні вёскі, з яе балячкамі і бядотай, з нястачай і гумовымі ботамі, таксама важныя.

Мы вельмі радыя кожнаму выхаду газеты «Наша Ніва».

З прывітаннем ад людзей,

**Аляксандр К., в.Андронавічы (Віцебская вобласць)**

### Хай нашы дзеўкі вісяць над ложкамі

**Хачу параіць Вам друкаваць у кожным нумары вялікі малюнак прыгожай беларускі.** Гэтак робіцца ў свеце. Толькі істотна адно: устрымацца ад пошласці. Хай нашы дзеўкі вісяць над хлапецкімі ложкамі. Belarusian is beautiful.

**Мікола Бусел, Дуброва (Светлагорскі раён)**

### Завершыўся марафон «Беларускую кнігу — дзецям»

**Цягам некалькіх месяцаў маладафронтаўцы збіралі літаратуру** на роднай мове для выхаванцаў дзіцячых дамоў. Яны перадалі кнігі ў дзіцячыя дамы ў чатырох абласцях, двух дзесятках гарадоў.

**Алесь Міхалок, Салігорск**

### Пытанне сеціваманкі

**Я ўжо нават магу прызнацца, што я — сеціваманка...** Трэба хутчэй пазбавіцца ад гэтай звычкі, але я не пра гэта.

На шматлікіх сайтах можна аўтаматычна перакласці старонку на якую хочаш мову, але зусім не часта на беларускую.

Я ў асноўным не звяртаю ўвагі, калі гэта датычыцца «нашых» сайтаў (чаго ад нашых чакаць?), але калі справа ідзе аб міжнародным сайце, тут ужо крыўда бярэ...

Гонар адказвае новым знаёмцам з усяго свету, што родная мова — беларуская. Але розум у гэты час пратэстуе: мы ж ёй карыстаемся толькі ў «святочных» выпадках! І вось некалькі дзён таму мой новы знаёмы (фін па нацыянальнасці) выказаў жаданне на ангельскай мове, што хоча размаўляць па-беларуску! Ён папрасіў у мяне адрас онлайн-перакладчыка. Уся справа ў тым, што дагэтуль яго ўразілі мае каментары на фінскай мове. Пачала я шукаць у тым перакладчыку беларускую мову і, зразумела што, не знайшла... І так мне сорамна стала! Пачала шукаць у сеціве і знайшла адзін, але і той са мной «размаўляць» не жадаў. Я так і папярэдзіла майго знаёмага, што, можа, яно і не будзе працаваць як трэба, але ён згадзіўся правесці выпрабаванні ў вольны час.

Няўжо не існуе на прасторах сеціва перакладчыкаў на беларускую мову, акрамя аднаго няўдалага ангельска-беларускага?

**Соня, даслана праз nn.by**

**Ад Рэдакцыі.** Інтэрнэт-перакладчыкі падказалі іншыя чытачы nn.by:
translate.eu
mylanguageexchange.com




У кнізе:
Цвялілкі,
Бубнілкі,
Лічылкі,
Лапатушкі,
А таксама:
Загаданкі,
Калыханкі,
Пацяшанкі,
Хуткамоўкі.

## Казачнік Бай (сапр. Дзядзька Рыгор)

«Радыёла-плюс» адшукала грошык
І выдала вершаў кошык.

Не чарговую для дарослых дуліну
ад Рыгора Барадуліна,
А для дзетак смяшынак мора
Ад дзядзькі Рыгора.

Дзядзька Рыгор не толькі свае ў кошык вершы складаў,
Але і з чужых у наш, беларускі, перакладаў:

З кошыка літоўскага,
З кошыка латышскага,
З кошыка казахскага,
З кошыка малдаўскага,
З кошыка азербайджанскага
і яшчэ шмат з якоганскага.

У кнізе:
Цвялілкі,
Бубнілкі,
Лічылкі,
Лапатушкі,

А таксама:
Загаданкі,
Калыханкі,
Пацяшанкі,
Хуткамоўкі.

А ну-ка, вымаўце хутка:
«Каштуе колькі колкі кончык іголкі?»

Кніга кнігаўкай ужо заляцела ў кнігарні.
(гэта не хуткамоўка,
а праўда, кожнае слоўка).

**ЛК**




**Рыгор Барадулін. Выпаў грук у грома з рук. Вершы, загадкі, лапатушкі...** — Мінск: Радыёла-плюс, 2008. — 158 с. — 3500 ас.

## Літаратурны конкурс для маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана

Беларускі ПЭН-цэнтр абвяшчае творчы конкурс для маладых літаратараў. Ён прымеркаваны да 75-годдзя з дня нараджэння Карласа Шэрмана.



Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 27 гадоў (на момант абвяшчэння конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны семінар і майстар-класы ў Мінск. «На конкурс прымаюцца літаратурныя творы тых жанраў, якімі быў слаўны Карлас Шэрман, а менавіта вершы, эсэ, мастацкія пераклады, — кажа куратар конкурсу і старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру Андрэй Хадановіч. — Таксама, у сувязі з тым, што сёлета мы адзначаем 200-гадовы юбілей Эдгара Алана По, для маладых перакладчыкаў уведзеная спецыяльная намінацыя «пераклад аднаго твору Э.А.По».

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпелі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазней за 20 сакавіка 2009 г. Падвядзенне вынікаў першага туру адбудзецца 20 красавіка.

Калі ласка, паведамляйце сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас, а таксама кантактныя тэлефоны.

Творы можна дасылаць на адрас: e-mail: pen@vessobel.by (з пазнакай «Літаратурны конкурс»). Паштовы адрас: 220050, а/с 218, Мінск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтр». Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Тыдзень беларускай лацінкі

прайшоў у інтэрнэце з 21 да 27 студзеня на ініцыятыву блогераў.

З ініцыятывы сімпатыкаў лацінічнага правапісу беларускай мовы, 21 студзеня інтэрнаўты адсвяткавалі Dzień Lacinki, а 21—27 студзеня зладзілі Tydzień Lacinki.

Ініцыятары заклікаюць у гэты тыдзень карыстацца лацінкай як найболей, але «дзе дарэчна і без блазноты».

Лацінкаю пісалі Дунін-Марцінкевіч і Багушэвіч, Купала, каталіцкія дзеячы Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. А таксама тысячы людзей, выхаваных у заходняй традыцыі беларушчыны. Лацінкаю да 1911 году, паралельна з кірыліцай, выходзіла «Наша Ніва». Дагэтуль надпісы беларускай лацінкай можна знайсці ў каталіцкіх храмах і на надмагіллях, на сядзібах незалежных арганізацый. Перадаваць геаграфічныя назвы ў адпаведнасці з беларускай лацінкай абавязваюць правілы картаграфіі.

У прасторы кірыліцы існуюць цяпер Беларусь, Украіна, Расія, Балгарыя. Сербія актыўна карыстаецца абодвума правапісамі. Пераход на лацінку за апошнія дзесяцігоддзі ажыццявілі ці ажыццяўляюць Узбекістан, Азербайджан, Малдова, Чарнагорыя, Македонія. Татарстану пераход на лацінку забаранілі цэнтральныя органы Расіі.

Беларуская лацінка падобная да іншых славянскіх або балцкіх:

«а» перадаецца як «a»
«б» перадаецца як «b»
«в» перадаецца як «v»...

З асаблівасцяў:

«ч» перадаецца як «č»
«ш» перадаецца як «š»
«ль» перадаецца як «l»
«л» перадаецца як «ł»
і гэтак далей.

Лацінічную раскладку і канвертар, які можа аўтаматычна пераводзіць тэкст з кірыліцы на лацінку і наадварот, распрацавалі праграмісты-аматары. Іх можна знайсці ў інтэрнэце ў свбаодным доступе.

**Мікола Бугай**




**Дагэтуль надпісы беларускай лацінкай можна знайсці ў каталіцкіх храмах і на надмагіллях.**




## Саліст «Старога Ольсы» моцна пацярпеў у вулічнай бойцы

Але 14 лютага гурт усё ж дасць канцэрт у к/з «Мінск».

На пачатку новага году гурт «Стары Ольса» аказаўся пад пагрозай распаду: іх бубнача забралі ў войска, гусляр заняўся ўласным праектам, флейтыстку пасылаюць на размеркаванне, у лютніста нарадзілася дачка, а да ўсяго лідэр гурту моцна пацярпеў у вулічнай бойцы. Але каманда ўсё ж рыхтуецца даць вялікі канцэрт на Дзень Святога Валянціна ў канцэртнай залі «Мінск».

Саліст Зміцер Сасноўскі **(на фота)** моцна пацярпеў, калі абараняў дзяўчыну — у яго пашкоджаныя сківаца і рука, так што музыка пакуль не можа граць на дудзе: «Біліся хвілінаў дваццаць, — апавядае Зміцер. — Цяжка сказаць, хто каму наваляў. З вялікімі праблемамі і траўмамі нас разнялі мясцовыя бандзюганы».

**Сяргей Будкін**

## Сабачыя вальсы для чалавека-аркестра

«Сабака» Юрася Пацюпы ўпоравень з бурлака-жыбулёўскай «Забі ў сабе Сакрата» — самыя вясёлыя паэтычныя кнігі гэтага сезону.

Акурат для тых, у каго на душы скрабуцца каты і каму карціць па-сабачы сквітаць на Месяц.

Пацюпа **(на фота)**, як усякі рэалістычны канцэптуал, падыходзіць да справы па-дзелавому. Памятаецца, у паветры лунала прапанова выдаць альбом аголеных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Замест гэтага абсалютна нездзяйсняльнага праекту Юрась папрасіў беларускіх літаратараў і літаратарак усяго толькі намаляваць па адным сабачку для яго зборніка. Унікнуўшы публічнага агалення,




убачыўшы, што ўсё абыходзіцца бяскрыўдным маляваннем, літаратары, на радасць (ці на гора) чытачам, ахвоча падпісаліся. І калі ласка: цяпер, на пострах дарослым пасляакцыбронскага веку і цяжарным экс-піянеркам, вершы (нават самыя чалавечныя), аздобленыя малюнкамі нашых найлепшых, але такіх нялюдскіх сяброў, злавесна бразгочуць сацрэалістычнымі ланцугамі, лаюцца за класічную костку, брэшуць на рамантычных «пастаронніх», адным словам, паказваюць свой постмадэрнісцкі ашчэр, паводзячы сябе цалкам па-сабачы.

**Лявон К.**




Юрась Пацюпа. Сабака. Вершы, эсэ, панегірыкі. — Мінск: Лімарыус, 2008. — 350 ас. — 55 с.

## Прэзентацыя новага Druvisa

прысвечанага тысячагоддзю першай пісьмовай згадкі Літвы (1009 г.), прайшла 24 студзеня.

Цэнтр этнакасмалогіі «Крыўя» выдаў другі нумар альманаху Druvis, які прысвечаны тысячагоддзю першай пісьмовай згадкі Літвы (1009 г.), а таксама дваццацігоддзю дзейнасці цэнтру.

У гэтым нумары альманаху чытачы знойдуць грунтоўныя артыкулы пра паходжанне назвы Літва, беларуска-літоўскія паралелі ў абсягу міфалогіі і традыцыйнай культуры, тутэйшую дударскую традыцыю, міфалагічную семантыку гербу «Пагоня», узроўні ідэнтычнасці шляхты ВКЛ, гісторыю літоўскай манархіі ды шмат іншага. Будзе цікава ўсім, хто цікавіцца прадаўняй гісторыяй нашага Краю.

**МБ**

## СЦІСЛА

**Гэй, ты, звон вялікі!**




У выдавецтве Беларускага Экзархату перавыдадзеная CD-кружэлка з запісам звону Храму Праабражэння Гасподняга (Заслаўе) — «Заслаўскі набат». На запісе званар, айцец Георгій РамаНоўскі, выконвае як кананічныя двухзвон і трохзвон, так і ўкладзеныя ім, адметныя, малінавы і вячэрні звон.

## IN MEMORIAM

### Валянціна Шчадрына

Жалобная вестка прыйшла з Масквы — там не стала перакладчыцы беларускай літаратуры Валянціны Шчадрыной. З яе лёгкай рукі расійскія чытачы пазнаёміліся з творамі Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Уладзіміра Арлова, іншых беларусаў.

Яна нарадзілася на Гомельшчыне ў 1927-м. Пасля заканчэння Белдзяржуніверсітэту нейкі час працавала ў Беларусі, а потым лёс закінуў яе ў Маскву. Там яна занялася перакладамі твораў беларускіх пісьменнікаў на расійскую мову, стала кансультантам Саюзу пісьменнікаў СССР па беларускай літаратуры. Узгадвае пісьменнік Уладзімір Арлоў:

«З Валянцінай Міканораўнай Шчадрыной я пазнаёміўся, калі ў маскоўскім выдавецтве «Молодая гвардия» выходзіла мая кніга «Пока не погасла свеча». Яна складалася з двух раздзелаў — умоўна кажучы, з гістарычнага і сучаснага. У адрозненне ад сучаснага раздзелу, які перакладаў проста халтуршчык, што схаваўся за прозвішчам Пяцібратаў, з перакладчыцай гістарычнага раздзелу мне пашанцавала. Валянціна Міканораўна бліскуча справілася са сваёй задачай. І ў тыя дні я, калі быў у Маскве, трапіў у яе гасцінную кватэру на Малой Грузінскай. Галоўнае ўражанне, якое засталося ад той сустрэчы, — уражанне пра тое, што яна, пражыўшы большую частку свайго жыцця ў Маскве, засталася носьбіткай беларускага нацыянальнага характару».

Дзе будзе пахаваны прах Валянціны Шчадрыной, яшчэ не вырашана. У яе засталіся дзве дачкі, трое ўнукаў і дзве праўнучкі.

**Радыё «Свабода»**

# Ці трэба ратаваць рэжым?

Піша **Лявон Баршчэўскі**.

Апошнім часам сярод людзей, імёны якіх фігуруюць у апазіцыйным дыскурсе, усё больш настойліва прапагандуюцца ідэі такога кшталту: «трэба размаўляць з рэжымам, дапамагаць яму атрымліваць крэдыты ад Захаду, а іначай...

— ...рэжым здасць суверэнітэт Беларусі,

— ...нашы суграмадзяне пацерпяць ад эканамічнага крызісу,

— ...нашы людзі не зразумеюць апазіцыю» — і г.д., і да т.п.

Гэта значыць, падобнага кшталту палітыкі прапануюць РАТАВАЦЬ... не, не суверэнітэт краіны, не інтарэсы нашых грамадзян, а існы РЭЖЫМ.

Будзьце спакойныя, спадарове: рэжым сам умее сябе ратаваць, лепей за нас. Менавіта гэты рэжым некалі ратаваў сябе, калі забараняў друк антыкарупцыйнага спавешчання Сяргея Антончыка ў найбольш тыражных газетах; калі гвалтам забіраў у законнаабранага парламенту «Народную газету».

Ён ратаваў сябе, калі ў ноч на 12 красавіка 1995 г. даваў загад брутальна збіваць дэпутатаў ад БНФ у Вярхоўным Савеце.

Рэжым ратаваў сябе, калі праводзіў шахермахерскія рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гадоў.

Чорных справаў майстры ва ўладных структурах ратавалі сябе, пазбаўляючы назаўсёды карміцеляў сем'і Юр'я Захаранкі, Генадзя Карпенкі, Віктара Ганчара, Змітра Завадскага і на працяглы час адбіраючы свабоду ў Міколы Маркевіча, Віктара Івашкевіча, Паўла Мажэйкі, Паўла Севярынца, Міколы Статкевіча, Андрэя Клімава, Міколы Астрэйкі, Аляксандра Казуліна, Андрэя Кіма, Змітра Дашкевіча, Антона Кішкурны...

Рэжым ратаваў сябе, прымаючы неканстытуцыйныя рэпрэсіўныя акты супраць свабоды сходаў, дэманстрацыяў, пікетаў, супраць свабоды слова.

Рэжым вельмі разлічваў на сваю вечнасць і непахіснасць, калі гвалтам мяняў праграмы па гісторыі, літаратуры, грамадазнаўстве ў сярэдняй школе і ВНУ, выганяў на вуліцу дзяцей і настаўнікаў Беларускага гуманітарнага ліцэю, выціскаў у эміграцыю Еўрапейскі гуманітарны універсітэт.



Кажуць, «пакуль тоўсты ссохне, дык худы здохне». Ды не, наш тоўсты ўсё адно не ссохне.

Ён ратаваў сябе, падпісваючы мінскія абавязацельствы перад незалежнымі СМІ і Стамбульскую дэкларацыю з абавязацельствамі перад міжнароднай супольнасцю.

Ратаваў сябе, калі прадаваў нашым прадпрыемствам па спекуляцыйных коштах нафту, газ, сыравіну, а здабытымі ў гэткі махлярскі спосаб мільёнамі рублёў затыкаў раты нашай інтэлігенцыі — каб яна не хадзіла на акцыі пратэсту.

Рэжым шукаў сабе паратунку, выганяючы з працы, з вучобы з «воўчымі білетамі» сотні і тысячы людзей толькі за тое, што яны не баяліся казаць уголас тое, што думаюць.

Ратаваў сябе праз публічныя здзекі з незалежнага Саюзу беларускіх пісьменнікаў, ператварэнне шмат якіх яго сяброў у жабракоў, праз незаконнае кіданне за краты Юр'я Хадыкі, Аляксея Марачкіна, Валянціна Голубева, Язэпа Янушкевіча, Алеся Жлуткі, праз подлае збіццё ў пад'ездах Радзіма Гарэцкага, Валер'я Мазынскага, Артура Вольскага, Юр'я Хашчавацкага Адама Мальдзіса, Уладзіміра Мархеля...

Халуі прыкарытнага існавання ратавалі гэты рэжым, б'ючы «мужнай мужчынскай рукою» ў твар Святлане Завадскай, заграбаючы ў войска маладых людзей, якія не могуць там служыць у звязку з станам здароўя...

І вось цяпер, выходзіць, мы павінны падставіць рэжыму плячо і ратаваць ЯГО?! Цяпер гора-палітыкі ў кароткіх штанцах просяць: дайце гэтым людзям грошай... каб не ўмёрлі. Памажыце ім, няшчасным, бо без іх Беларусі ну ніяк не праіснаваць: яны ж кіруюць дзяржавай і нам даюць у нашай хаце начаваць... пад лаваю.

А можа, калі-небудзь каму-небудзь з нас ласкава выдзеляць і высока аплачванае месца ў сваёй «палатцы» ці хоць бы запросяць на душэўную гутарку з кавай да рэдактара галоўнай «правільнай» газеты...

Ёсць даўняя прымаўка: «Пакуль тоўсты ссохне, дык худы здохне». З яе, вядома, можна зрабіць выснову: маўляў, не дамо «тоўстаму» (г.зн., цяперашняй уладзе) ссохнуць, а тое мы ўсе можам скапыціцца. Заганная гэта выснова. «Тоўсты» ўсё адно не ссохне. А мы? А мы можам няўрокам і спруцянець — калі, вядома, будзем слухацца падобных дарадцаў...

**Лявон Баршчэўскі**

старшыня Партыі БНФ, заявіў аб жаданні выставіць сваю кандыдатуру на прэзідэнта краіны на выбарах–2011. Педагог, кандыдат філалагічных навук, у 1990—1995 — дэпутат Вярхоўнага Савету ад Наваполацку.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Каложа патрабуе рэстаўрацыі з выкарыстаннем кантрастных матэрыялаў

а не перабудовы. Піша **Аляксандр Мілінкевіч**.

З непакоем даведаўся пра намер распачаць «рэканструкцыю» Каложскай царквы ў Гродне. Сам тэрмін страшыць, бо гэты унікальны помнік сакральнай архітэктуры патрабуе не «перабудовы», а навуковай рэстаўрацыі.

Добра, што гродзенскія ўлады разумеюць: Каложа — адзін з найбольш унікальных турыстычных аб'ектаў гістарычнай спадчыны Беларусі — патрабуе тэрміновай увагі. Недапушчальна тое, што праект не быў публічна абмеркаваны і абсалютна не адпавядае тэндэнцыям сучаснай еўрапейскай традыцыі рэстаўрацыі помнікаў такога ўзроўню.

На пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ў Гродзенскім гарвыканкаме мы сур'ёзна працавалі над канцэпцыяй адраджэння Каложскага храму. Праект ствараўся ў супрацоўніцтве з навукоўцамі і экспертамі з Францыі і Польшчы і быў падтрыманы ў той час ЮНЕСКО як адзін з найлепшых у Еўропе. У Гродна прыязджалі спецыялісты з Парыжу і Ліможу. Яны падкрэслівалі унікальнасць архітэктурнага стылю царквы, яе значэнне для гісторыі еўрапейскай культуры і прапанавалі правесці толькі так званую «празрыстую» рэстаўрацыю. Гэта значыць, аднавіць згубленую частку помніка з кантраснага матэрыялу — напрыклад, такога натуральнага для Беларусі, як дрэва. Паводле сучасных падыходаў навуковай рэстаўрацыі, у такіх выпадках, як з Каложай, новае дабудаванае павінна лёгка адрозніваца ад старажытнага па колеры, па структуры нават для вока звычайнага турыста.

На думку еўрапейскіх экспертаў, нельга спрабаваць аднавіць неіснуючую частку храму XII стагоддзя з сучасных матэрыялаў, якія імітуюць арыгінальныя гістарычныя, бо гэта знішчыць яго унікальнасць назаўсёды.

Лічу неабходным адмовіцца ад ідэі «рэканструкцыі» Каложскай царквы і зрабіць шырокае навуковае і грамадскае абмеркаванне канцэпцыі рэстаўрацыі згодна з сучаснай еўрапейскай традыцыяй. Паколькі ў нашай краіне няма сваёй школы рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, пры рэалізацыі будучага праекту варта запрасіць у якасці кансультантаў адмыслоўцаў з краінаў Еўрасаюзу, перш за ўсё з Польшчы і Літвы. Шчыра прапаную сваю дапамогу ў гэтай добрай справе.

**Аляксандр Мілінкевіч**

старшыня Руху за Свабоду, былы кандыдат у прэзідэнты, у сярэдзіне 1990–х — намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкаму.

# Бацька дзяржаўнасці

**29 студзеня спаўняецца 125 гадоў ад нараджэння Антона Луцкевіча. Чалавека, дзякуючы якому мы жывем сёння ў незалежнай дзяржаве.**



Калі ў Беларусі будуць грошы з выявамі гістарычных дзеячаў, на адной з купюраў дакладна мае быць партрэт Антона Луцкевіча. Можа, на самай хадавой, кшталту $1 з Вашынгтонам, першым прэзідэнтам ЗША. Ці то на самай саліднай у грашовай сістэме, як $100 з Франклінам, чый подпіс стаіць пад Дэкларацыяй незалежнасці і амерыканскай Канстытуцыяй.

Антон Луцкевіч быў менавіта «бацькам беларускай дзяржавы». Без яго беларусы маглі б застацца племенем на картах Яўхіма Карскага.Ператварэнне з этнічнай супольнасці ў мадэрную палітычную нацыю — заслуга Луцкевіча і яго аднадумцаў. Роля асобаў у гісторыі.

Іх дбаннямі на сацыяльным і нацыянальным уздыме пачатку XX стагоддзя паўстала першая наша палітычная партыя — Беларуская Сацыялістычная Грамада. Каля яе, калі царызм пачаў лібералізацыю, утварыўся першы беларускамоўны СМІ — легальная газета «Наша Ніва». Яна стала цэнтрам нацыятворчых працэсаў. А з нашаніўскага кола выраслі палітыкі, настаўнікі, навукоўцы, класікі літаратуры. Здзяйсненнем мараў, плёнам працы таго пакалення стала ноч з 24 на 25 сакавіка 1918 году, калі ў Мінску была абвешчаная незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Малавядомы факт: аўтарам тэксту III Устаўной граматы быў Антон Луцкевіч. Хоць подпісу яго пад дакументам няма. Ён не гнаўся за пасадамі і пазіцыямі.

Дый айцоў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі не прывезлі нам у апламбаваным вагоне. Яе, паверыўшы бальшавікам, стваралі людзі таго ж грамадоўска-нашаніўскага прызыву — Жылуновіч, Чарвякоў, Шантыр... Яшчэ пытанне: ці была б з Масквы згода на БССР, каб не пагроза страты кантролю над беларускімі тэрыторыямі, на якіх паўставала БНР?

І наколькі лепшыя стартавыя пазіцыі мелі б беларусы ў 1991-м, калі б удалося, як літоўцам і латышам, вырваць тады незалежнасць на міжваеннае дваццацігоддзе...

Але гэтыя пытанні ўжо не да Антона. Зерне, кінутае ім у ніву, хавалі ад маразоў іншыя. За ўсе ж даброты, якія мы маем ад беларускай незалежнасці, варта яму падзякаваць.

**Антон Луцкевіч**

**(1884—1942), палітычны і грамадскі дзеяч. З шляхецкага роду гербу «Навіна». Брат Івана Луцкевіча. Дзяцінства іх прайшло ў Мінску. Вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Пецярбургскага, юрфаку Дэрпцкага універсітэтаў. Адзін з заснавальнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады (1903). Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907. У лютым 1906 перайшоў на нелегальнае становішча, пераехаў у Вільню. Удзельнічаў у заснаванні газет «Наша доля» і «Наша Ніва» (1906). Аўтар канцэпцыі дзяржаўнага ўладкавання Беларусі, Літвы і Украіны ў выглядзе Злучаных штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мораў. Ініцыятар абвяшчэння незалежнасці БНР. Займаў пасады старшыні Рады міністраў, міністра замежных справаў БНР. У пачатку верасня 1919 інтэрнаваны ў Варшаве польскімі ўладамі. Стварыў Беларускі музей імя Івана Луцкевіча. Арыштаваны польскімі ўладамі, абвінавачаны ў шпіянажы на карысць Германіі і СССР, апраўданы судом (1928). Крытыкаваў нацыянальную і аграрную палітыку СССР. У 1930-я адышоў ад палітыкі, працаваў у Беларускім навуковым таварыстве. 30 верасня 1939 арыштаваны НКВД. Памёр на перасылцы ў Аткарску Саратаўскай вобласці у 1942. Рэабілітаваны ў 1989.**

# Луцкевіч на допытах

**Допыты цягнуліся да 36 гадзін. Луцкевіч не зламаўся. Яго агаварылі... расстраляныя. Раскрыліся падрабязнасці следчай справы. Піша гісторык Анатоль Сідарэвіч.**

Бальшавікі арыштоўвалі Антона Луцкевіча двойчы. Першы раз ён трапіўся карным органам пры «першых саветах», у ліпені 1920 г. Справа асобага аддзелу ВЧК 4-й арміі па абвінавачанні ў контррэвалюцыі Луцкевіча Антона захоўваецца ў Асобым архіве Літвы.

20 ліпеня 1920 г. з заяваю ў ЧК звярнулася лекар Абрамовіч (Зоф'я Абрамовіч, жонка Луцкевіча, цяжарная ў той час іх першым сынам). Яна паведамляла, што 19 ліпеня яе муж быў затрыманы на вуліцы, прасіла высветліць прычыны арышту і вызваліць, бо ён хворы на сухоты, што пані Зоф'я сведчыла як лекар.

Ператрус на кватэры Луцкевіча праводзіў чэкіст А.Корф. Контррэвалюцыі не знайшоў — ні зброі, ні боепрыпасаў, ні антысавецкіх матэрыялаў. Але Луцкевіча пакінулі пад вартай на Лукішках, завялі справу за №74 і пачалі дапытваць. Следчы Гурэвіч загадаў вязню апісаць сваё жыццё з 1917 г. і да арышту. Паколькі Луцкевіч прызнаўся, што належыць да Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і быў прэм'ер-міністрам Беларускай Народнай Рэспублікі, следства зацікавілася, чым займалася БСДП і як ставілася да бальшавікоў, ці былі ў Радзе БНР паны і іншыя «класава чужыя элементы». Асаблівы інтарэс выклікала Беларуская вайсковая камісія. Нічога сенсацыйнага ў прызнаннях падследнага няма. Звяртае ўвагу тое, што Луцкевіч *не пісаў няпраўды*. Нявыгадныя (з пункту гледжання бальшавікоў) факты проста не згадваў. Затое акцэнтаваў увагу на тым, што супрацьстаяў польскім захопніцкім планам у дачыненні да Беларусі, за што быў інтэрнаваны ў Варшаве ўвосень 1919-га. А якраз у разгары была савецка-польская вайна. Пра Беларускую вайсковую камісію Луцкевіч напісаў, што сам удзелу ў яе фармаванні не браў, складу не памятае, і адаслаў следчых да газет, у якіх гэты склад быў апублікаваны. А пра тое, што БВК паўстала пасля яго сустрэчы з Пілсудскім, сціпла прамаўчаў.

У заключэнні следчы адзначаў, што А.Луцкевіч у БСДП займаўся партыйнай працай (то бок, не тэрарыст), што ў якасці прэм'ер-міністра БНР змагаўся супраць «анексіянізму Польшчы і ўраду Калчака». А на пачатку 1919-га, калі ў Мінску быў урад першай БССР, Луцкевіч у Гродне займаўся арганізацыяй сялянскіх радаў, што БСДП стаіць на савецкай платформе, разыходзячыся з камуністамі ў аграрным пытанні... Следчы пастанавіў 31 ліпеня 1920 г. Луцкевіча выпусціць і справу закрыць. Адзінае ўзялі падпіску, што без ведама ЧК з Вільні не паедзе і будзе жыць на вул.Віленскай, д. 33, кв. 1.

Чаму бацька БНР так лёгка выскачыў? Многа прычынаў. Бальшавікі яшчэ не пачалі татальнага пераследу іншадумцаў. Таксама ў першай палове жніўня 1920-га яны ішлі на Варшаву і хацелі мець у Беларусі надзейны тыл. Дый расправа з Луцкевічам, знаёмым з паловай кіраўніцтва БССР, ударыла б па іміджы.

Следчы называў Луцкевіча «таварыш». Яшчэ не збудавалі тады бальшавікі мур між сабой і іншымі сацыялістамі, яшчэ не пачала партыя жыць паводле законаў крымінальнай шайкі, дзе адны «мочаць» другіх.

Зусім іншыя гутаркі вяліся з Луцкевічам пасля арышту ў 1939 г. У кнізе «Антон Луцкевич: материалы следственного дела НКВД БССР» (1997), выдадзенай гісторыкамі Уладзімірам Міхнюком, Аляксандрай Гесь ды Мікалаем Клімовічам, ёсць пратаколы шасці допытаў А.Луцкевіча ў мінскай турме № 1 паводле справы, заведзенай 30 верасня 1939 г. У фотакопіях матэрыялаў справы, якія перадаў мне з Вільні гісторык Алесь Смалянчук, пятнаццаць пратаколаў.

**Сваім прызнаннем Луцкевіч легітымізаваў бы знішчэнне заходнебеларускай палітычнай эліты.**

З іх вынікае, што вязня толькі ў пяці выпадках дапытвалі ўдзень. Як правіла, «працаваць» следчыя пачыналі пасля 22.50. Допыт мог скончыцца і а 3-й ночы, і пазней. 14 лютага 1940 г. яго дапытвалі з 1.00 да 5.15, а на наступныя суткі паставілі «на канвеер», бо допыт працягваўся 24 гадзіны 15 хвілін. І гэта не рэкорд. У пратаколе ад 14 студзеня 1940 г. запісана, што допыт пачаўся ў 12 гадзін дня і скончыўся ў 24 гадзіны 15 студзеня. Выходзіць, з Луцкевічам «гутарылі» 36 гадзін запар.

Следства дабівалася, каб Луцкевіч прызнаў, што дзеячы Беларускай сялянска-работніцкай грамады і «Вызвалення» (Дварчанін, Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі), пасля разгрому беларускіх сілаў у Польшчы, былі засланыя ім у БССР «для арганізацыі тэрарыстычна-паўстанцкай дзейнасці». Большасць гэтых людзей былі ўжо расстраляныя НКВД па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтру», сфабрыкаванай для расправы над імі. Сваім прызнаннем Луцкевіч легітымізаваў бы вынішчэнне заходнебеларускай палітычнай эліты. Ён разумеў гэта. Бацьку беларускай дзяржаўнасці тады было амаль 56 гадоў. Нават турэмныя лекары фіксавалі ў яго аслабленне сардэчнае мышцы, малакроўе, агульнае знясіленне.

Але Антон Луцкевіч не парадаваў следчых. Не пацвердзіў таго, што тэрарыстычна-паўстанцкі «Беларускі нацыянальны цэнтр» існаваў (і, адпаведна, расстрэлы былі справядлівыя). Не пацвердзіў, як дамагалася НКВД, што сябры БНЦ былі агентамі польскай контрразведкі, а сам ён у часы Першай сусветнай працаваў яшчэ і на нямецкую...

Тады для абвінаваўчага заключэння былі выкарыстаныя матэрыялы допытаў тых самых грамадоўцаў, якіх ён нібыта «засылаў» у БССР. Выпіскі з паказанняў Браніслава Тарашкевіча (1938 г.) занялі ў следчай справе 49 старонак. Следам ідуць выпіскі з паказанняў Сымона Рак-Міхайлоўскага (14 старонак), Язэпа Лагіновіча (28 старонак).

Луцкевічу далі восем гадоў Варкуцінска-Пячорскага лагеру. Аднак аўтару Акту 25 Сакавіка было наканавана памерці 23 сакавіка 1942 на перасыльным пункце Аткарск у Саратаўскай вобласці.

Следчыя справы Луцкевіча павінны ўбачыць свет у поўным аб'ёме. Як і матэрыялы сённяшніх палітычных справаў, гэта гістарычны дакумент, які кажа пра час напісання болей, чым апасродкаваныя навуковыя працы. Беларуская ўлада, якая зрабіла «лінію Сталіна» ўзорам для патрыятычнага выхавання, не будзе займацца такімі выданнямі. Як не будзе яна, адчуваючы пераемнасць, рассакрэчваць архівы НКВД на сваёй тэрыторыі. Публікацыя матэрыялаў справы Луцкевіча кладзецца на незалежнае грамадства.

**Дзякуючы таму збегу абставінаў, што Луцкевіча арыштавалі ў Вільні, а дапытвалі ў Маскве, мы можам азнаёміцца з яго справай**

Яна захоўваецца ў адкрытых сёння літоўскіх архівах, бо матэрыялы следства высылаліся па месцы арышту. Прычым трапілі яны туды ў паваенны час з Масквы. Адпаведна, не згінулі, як справа арыштаванага і дапытанага ў Беластоку Макара Краўцова, якая магла згарэць разам з турмой у першую ж бамбёжку. І не захоўваецца ў закрытых для даследчыкаў фондах беларускага КДБ, як справы арыштаваных у Мінску і Гродне беларускіх дзеячаў.

**Навуковыя артыкулы Луцкевіча, канфіскаваныя падчас арышту, так і ляжалі ў архівах НКВД**

Гэта 16-старонкавы рукапіс на польскай мове «Нарысы з гісторыі беларускае літаратуры», і машынапіс «Культура і цывілізацыя» з аўтарскімі праўкамі. Якія яшчэ працы хаваюць следчыя справы нашых дзеячаў навукі і культуры, рэпрэсаваных у 1930—1950-я?



## КАНЦЭРТЫ

**Вайцюшкевіч у «Добрых мыслях»**

**4 лютага а 20-й у фальварку «Добрыя мыслі» (Магілёўская, 12)** — сольны канцэрт Зміцера Вайцюшкевіча

**«Стары Ольса»**

**14 лютага ў КЗ «Мінск»** гурт «Стары Ольса» прэзентуе новы альбом «Дрыгула». **Пачатак у 19.00.**

**Музычныя вечары**

**31 студзеня а 16-й у Музычнай гасцёўні Дому Ваньковічаў (Інтэрнацыянальная, 33а)** адбудзецца першы канцэрт цыклу «Музычныя вечары ў музеі». Прагучыць сакральная музыка Беларусі і Заходняй Еўропы XVII — XVIII стст. У праграму ўвайшлі творы Дж.Пергалезі, Г.Гендэля, Л.Клары, а таксама вершы Сімяона Полацкага, пакладзеныя на музыку невядомым кампазітарам XVIII ст.

**Партытуры магнацкага двору**

**29 студзеня ў Малой зале імя Рыгора Шырмы (пр.Незалежнасці, 50)** адбудзецца канцэрт «Партытуры магнацкага двору». Музыка «ганаровых ушанаванняў», музыка «палацавых падзей»... Якой яна была ў Беларусі? Пра гэта можна даведацца на канцэрце, праслухаўшы агучаныя рукапісы прыдворных бібліятэк у выкананні ансамблю салістаў «Класік-Авангард» Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава.

**2009-HARD-PARTY**

**30 студзеня ў клубе Night Star (Свярдлова, 2)** — фестываль альтэрнатыўнай музыкі 2009-HARD-PARTY

**GARADzKIJA**

**27 студзеня а 19-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — акустычны канцэрт GARADzKIJA

## ВЫСТАВЫ



**Савіцкі, Данцыг, Паплаўскі...**

**У Палацы мастацтва (Казлова, 3) да 15 лютага** працуе Першая рэспубліканская выстава «Традыцыя і сучаснасць». Экспануюцца творы Міхася Савіцкага, Мая Данцыга, Георгія Паплаўскага.

**Чуньцзэ**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 7 лютага** працуе сумесная выстава твораў маладых мастакоў Кітаю і Беларусі, прысвечаная Кітайскаму Новаму году — Святу Вясны «Чуньцзэ». Будуць дэманстравацца работы выпускнікоў 10 мастацкіх акадэмій КНР — партрэты, пейзажы, фігуратыўныя кампазіцыі, а таксама работы выпускнікоў БДУ культуры і мастацтваў (мастацкі тэкстыль) і студэнтаў Беларускай акадэміі мастацтваў (жывапіс).

**Экашык: На шляху да экалагічный шведскай моды**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі (Маркса, 12) з 4 лютага** працуе выстава экалагічнай шведскай моды «Экашык» — для ўсіх, каго цікавяць пытанні ўстойлівага развіцця, аховы навакольнага асяроддзя і моды, а таксама іх узаемадзеяння. У рамках выставы пройдзе майстар-клас па стварэнні экалагічнай вопраткі.




**Чатырнаццаць гісторыяў**

Выстава сучаснага ландшафтнага партрэту фатографа Віталя Раковіча адкрыецца ў **PhotoGallery ZHЯTA (пр. Незалежнасці, 13) 30 студзеня а 19-й.**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатр**

**29 (чц)** — «Памінальная малітва»
**30 (пт)** — «Слуга двух гаспадароў»
**31 (сб)** — «Вечар»
**1 (ндз)** — «Паўлінка»
**2 (пн)** — «Чорная панна Нясвіжу»
**3 (аўт)** — «Загадкавыя варыяцыі»
**4 (ср)** — «Маэстра»
**5 (чц)** — «Сымон-музыка»
**6 (пт), 7 (сб)** — «Ядвіга»
**8 (ндз)** — «Макбет»
*ранішнія спектаклі*
**1 (ндз)** — «Паўлінка»
**8 (ндз)** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
*малая сцэна*
**30 (пт)** — «Варшаўская мелодыя»
**31 (сб)** — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**2 (пн)** — «Балада пра каханне»

**Опера**

**31 (сб)** — «Спяваю каханне...»
**1 (ндз)** — «Церам-Церамок»
**1 (ндз)** — «Вяселле Фігаро»
**6 (пт)** — «Рыта, альбо Піраццкі трохкутнік», «Бах... Кава... Джаз...»

**Тэатр юнага гледача**

**29 (чц)** — «Рыцар Ордэна Сонца»
**31 (сб)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда»
**5 (чц)** — «Нататкі музыківар'ята»
**7 (сб)** — «Маўглі»
**8 (ндз)** — «Каралеўства крывых люстэркаў»

## КАНФЕРЭНЦЫЯ

**Люблю Беларусь**

**1 лютага а 12-й на пр.Машэрава, 8** — практычная канферэнцыя, прысвечаная праблемам беларускай мовы і беларускай нацыянальнай культуры «Люблю Беларусь». Па дадатковую інфармацыю, а таксама ўсіх ахвотных дапамагчы ў арганізацыі мерапрыемства просім звяртацца на т.: (029) 763-59-54. Віталь




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Любоў вусатай свінні

**Пунсовы свін** (Kurenai no buta)

Японія, 1992, каляровы, 93 хв.

**Рэжысёр:** Хаяа Міядзакі

**Жанр:** Анімэ, рэтра-драма паводле мангі Міядзакі «Успаміны пра эпоху гідрасамалётаў»

**Адзнака:** 10 (з 10)

Пілот Марка пасля Першай сусветнай вайны расчараваўся ў сабе і людзях. У яго вырас сапраўдны свіны лыч ды вушы. Ніхто не ведае, як і чаму з'явіўся гэты праклён, але гэта не замінае герою змагацца з піратамі і ўцякаць ад таемнай паліцыі. Ён — біч нягоднікаў і абаронца слабых. Яму зайдросцяць і яго паважаюць. У гэтую вусатую свінню закаханыя самыя прыгожыя жанчыны.

Напачатку фільм Міядзакі мусіў стаць толькі рэкламна-забаўляльным ролікам японскіх авіяліній. Але рэжысёр зрабіў з яго поўнаметражную прыпавесць, якой цяжка знайсці адпаведнік у гісторыі кіно.

Карціна Міядзакі — шэдэўр стылю. Чыстая, магічная, філасофская казка пра тое, як цяжка быць чалавекам сярод свінняў, калі ты і сам свін. Гэта таксама меладрама — з чароўнай музыкай — пра сум і самоту сэрца, якое ўхіляецца ад любові.

Фільм выйшаў у абмежаваны пракат у суседскіх краінах, у Беларусі ён даступны на лічбавых носьбітах.

Таксама глядзіце на беларускіх экранах: «Вікі Крыстына Барселона» — меладраму Вудзі Алена з Пенелопай Круз, Скарлет Ёхансан і Хаўерам Бардэмам. Фільм дэманструецца ў межах праграмы «Канаманія ў Доме кіно». У шырокім пракаце комікс «Мсціўца» майстра малюнкаў Фрэнка Мілера, які пасля супрацы з Радрыгезам дэбютаваў у рэжысуры (фільм на аматара).

**Андрэй Расінскі**



# «Белсат»: тэлепраграма на 2—8 лютага
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 2 лютага, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 11 серыя
**19.00** «Дарога праз стэпы між аазісаў» (Step Road Oasis), дак. фільм, 2007 г., Японія
**19.55** Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча ў тэатры «Буфо», ч. 1
**20.30** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «Без рэтушы»: «Людзі старой веры», дак. фільм, 2008 г.
*Пётр Дзяменцьеў з Відзаў — настаўнік мясцовай грамады старавераў. Свае набажэнствы гэтая парафія, што месціцца побач з беларуска-літоўскаю мяжою, адпраўляе ўжо з дзесяць гадоў. Самі стараверы паходзяць з Расіі, прыйшлі сюды адтуль 300 гадоў таму, ратуючыся ад дзяржаўнага пераследу пасля рэформы Маскоўскае праваслаўнае царквы, якую правёў патрыярх Нікан. Таго, хто адмаўляўся маліцца па-новаму, царская ўлады гвалтам змушалі прыняць рэформу, калі ж чалавек усё роўна трымаўся «старое веры» — пазбаўлялі маёмасці і нават каралі смерцю. Вялікая колькасць уцекачоў знайшла прытулак у Вялікім Княстве Літоўскім. Чарговая хваля пераследу стараввераў узнялася пры саветах. Камуністы нішчылі іхнія цэрквы, прымушалі выракацца веры, забіралі зямлю, высылалі ў Сібір.*
*Адраджэнне стараверскае царквы распачалося толькі на пачатку 1990-х, найперш дзякуючы дзейнасці такіх людзей, як Пётр Дзяменцьеў, які ўласным прыкладам пераконваў навакольных жыхароў вярнуцца да веры продкаў.*
**21.50** «Развод па-амерыканску» (Serving Sara), камедыя, рэж. Рэджыналд Гадлін (Reginald Hudlin), 2002 г., ЗША. У ролях: Элізабэт Гэрлі (Elizabeth Hurley), Мэт'ю Пэры (Matthew Perry), Брус Кэмпбэл (Bruce Campbell), Эмі Эдамс (Amy Adams).
**23.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 11 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 3 лютага, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 11 серыя
**19.00** «На злом галавы» (Gegen Die Wand), маст. фільм, рэж. Фатых Акын (Fatih Akin), 2004 г., Германія—Турцыя. У ролях: Біроль Юнэль (Birol Unel), Зыбэль Кекіллі (Sibel Kekilli).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Урок беларускай мовы», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбінскі (Miroslaw Debinski), 2006 г., Польшча
**22.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**22.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 12 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 4 лютага, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 12 серыя
**18.55** Беларусы ў Польшчы
**19.15** «Дажыць да любові», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2002 г., Беларусь
**20.10** Віртуальная помпа (агляд сеціва)




**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярная праграма тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)




**21.15** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**21.45** «Без рэтушы»: «Іншае жыццё», дак. фільм, 2008 г.
**22.35** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**22.55** «Minsk-Mixt—2008», ч. 6: канцэрт гурту «Ветах»
**23.05** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 4 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 5 лютага, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 4 серыя
**19.10** Кружэлка (сусветная музыка)
**19.45** Хто ёсць кім: Алесь Лось




**20.05** «Тата генерал! Беспрытульныя дзеці ў расійскім войску», рэпартаж, 2007 г.
**20.40** Кінастужка (агляд кінанавінаў)
*Праграма для аматараў кінамастацтва, найперш маладога пакалення. Аўтары бачаць галоўную задачу ў тым, каб пазнаёміць гледачоў з інфармацыяй пра найбліжэйшыя кінапрэм'еры ў Беларусі, а таксама расказаць пра навіны кінаіндустрыі.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.05** Інтэрнаўты выбіраюць
**23.00** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 5 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 6 лютага, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 5 серыя
**19.10** Праект «Будучыня»: навукова-папулярная праграма тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** «Сталін. Смерць дыктатара», дак. фільм, рэж. Гэльге Трампэрт (Helge Trampert), Інга Вольфрам (Inga Wolfram), 2003 г., Германія
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**21.30** Бульбаны
**21.40** «Girl guide», маст. фільм, рэж. Юльюш Махульскі (Juliusz Machulski), 1995 г., Польшча
**23.10** «Пітбуль», серыял, 12 серыя




**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 7 лютага, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Прадстаўленне», дак. фільм, рэж. Сяргей Лозніца, 2008 г.
**20.00** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.30** Падземка (беларускі хіт-парад)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Маю права (праввая праграма)




**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** «Энтані Цымэр» (Anthony Zimmer), дэтэктыўная меладрама, рэж. Жэром Саль (Jerome Salle), 2005 г., Францыя. У ролях: Сафі Марсо (Sophie Marceau), Іван Аталь (Yvan Attal), Даніель Альбрыхскі (Daniel Olbrychski).
*Інтэрпол шукае геніяльнага фінансавага махляра Энтані Цымэра, які адмывае «брудныя» грошы, у тым ліку і для расійскай мафіі. Мафія таксама пераследуе Цымэра, бо той зашмат ведае. Энтані нічога не застаецца, як цалкам змяніць сваё аблічча. Адзінае слабое месца Цымэра — гэта ягоная каханка К'яра...*
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычныя праграма)




**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 8 лютага, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял, 12 серыя
**19.05** Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча ў тэатры «Буфо», ч. 2
**19.35** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.05** «Цэнтральная Азія — з занядбанага краю на Радзіму», дак. фільм, 2007 г., Японія.
*Японскія кінадакументалісты вандруюць уздоўж Вялікага шаўковага шляху. У гэтай серыі распавядаецца пра адну з дарог Вялікага шляху — праз казахскія стэпы, з цэнтральнай Азіі да паўднёвай Расіі. Мы сустракаем казахаў, якія вярталіся з Кітаю, куды былі вымушаныя перасяліцца; дэпартаваных чачэнцаў, што не могуць вырашыць, вяртацца на ахопленую вайною радзіму ці не; казакоў, якія аднаўляюць свае традыцыі часоў Расійскай імперыі...*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)




**21.20** Ток-шоу «Форум»: «На каго абрынуўся рубель».
*Раніцаю 2 студзеня беларусы пабяднелі прыкладна на мільярд даляраў. Замежная валюта з абменнікаў знікла надзвычай хутка. У першым сёлета выданні ток-шоу «Форум» — тэма дэвальвацыі беларускага рубля. У віленскай студыі вядоўца Эдуард Мельнікаў дыскутуе са знанымі незалежнымі эканамістамі і вядомымі палітыкамі.*
**22.10** Бульбаны
**22.20** «Жаночы раман» (Roman pro zeny), маст. фільм, рэж. Філіп Рэнч (Filip Renc), 2005 г., Чэхія. У ролях: Зузана Канац (Zuzana Kanoczova), Марэк Вашут (Marek Vasut), Сімана Сташава (Simona Stasova).
*Экранізацыя аднайменнай кнігі сучаснага чэшскага пісьменніка Міхала Вівэга. У пражскім метро на месцы рэкламы з'яўляюцца лісты з прызнаннем у каханні да Ляўры, напісаныя нейкім Олівэрам...*
**00.10** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Як зарабіць на крызісе

Фельетон **Лёліка Ушкіна**.

Оскар А., першы памочнік намесніка міністра рыбнай прамысловасці Ісландыі, асцярожна ступіў на платформу мінскага чыгуначнага вакзалу. Ён быў накіраваны ў далёкую краіну без мора і гейзераў, калі прэм'ер яго краіны пабачыў на сайце беларускага ўраду аб'яву: «Лекцыя: «Як зарабіць на крызісе». Поспех гарантаваны. Кошт удзелу: 500 тысяч у.а.». Гэта быў шанец для эканомікі Ісландыі.

— Містэр, ці не жадаеце праслухаць курсы «Як зарабіць на крызісе». Усяго дзесяць даляраў», — абарваў яго думкі падазроны тып. О — шанец зэканоміць бюджэтныя сродкі! Заінтрыгаваны іншаземец сеў у машыну, якая паляцела у бок прыватнага сектару. Курс, які меў тычыцца макраэканомікі, фінансавага і банкаўскага менеджменту, чытала бабулька з дзіўным прозвішчам Пятроўна.

— Ну што, мой харошы, хана нашай эканоміцы, — заўсміхалася яна. — Але не ўсё так дрэнна: ёсць метад, як зарабіць на крызісе...

— Усім ляжаць! — у пакой ваваліўся нарад АМОНу ў чорных масках.

Праз дзесяць хвілін інтурыст у пастарунку слухаў мараль лейтэнанта аб тым, што ён мае быць асцярожным з падобнымі курсамі. Каб іх чытаць, трэба адпаведная ліцэнзія.

Першым, што Оскар пабачыў, калі выйшаў з пастарунку, быў бігборд з надпісам: «Курс лекцый: «Крызіс — час вялікіх бізнес-магчымасцяў». Уваход: дваццаць кілаграмаў калійнай солі Беларускага калійнага камбінату».

— Сэр, ці не жадаеце наведаць лекцыю «Як зарабіць на крызісе», — да ісландца падкаціла дзяўчына. Кошт — сто шарыкападшыпнікаў Мінскага заводу шарыкападшыпнікаў. Ёсць ліцэнзія!

Аднак лекцыі супастат так і не паслухаў. Першыя словы дакладчыка — «Хана нашай эканоміцы, але...» — былі абарваныя адным з слухачоў, які аказаўся пераапранутым агентам Дзяржкантролю.

Аказалася, што чытанне лекцый «Як зарабіць на крызісе», за уваход на якія трэба набыць прадукцыю таго ці іншага прадпрыемства, рэгулюецца спецыяльным Указам. І бюджэтаўтваральныя прадпрыемствы — напрыклад, «Беларуськалій» — тут маюць прыярытэт. А прадпрыемствы другога эшалону, кшталту шарыкападшыпнікавага, могуць ладзіць лекцыі выключна пад назвай «Як зусім трошкі закалыміць на крызісе».

Каб Оскар яшчэ куды не трапіў, міліцыянты адразу даставілі яго ў будынак МЗС. Заплаціўшы ўнёсак за ўдзел, турыст асцярожна праслізнуў у залу і азірнуўся. Людзей было да халеры.

Дакладчык бадзёра гундосіў у мікрафон: «Такім чынам, зарабіць на крызісе проста. Вазьміце аркуш паперы. Парэжце яе на кавалкі...»

«Можна не так хутка — мы канспектуем!» — у адзін голас папрасілі двое з суседняга шэрагу. Оскар пазнаў у іх Абаму, загрыміраванага пад Сарказі, і Сарказі, загрыміраванага пад Абаму. «Які жах», — падумаў ісландзец. Якраз план Абамы ў барацьбе з крызісам Рэйк'явік збіраўся пераймаць.

«...цяпер рэжам на кавалкі, — паўтарыў прамоўца. — Далей: бярэм аловак і пішам на тых паперках: «Курс лекцый: «Як зарабіць на крызісе». Вешаем аб'явы у сябе на раёне, і стрыжэм капусту з білетаў, што набываюць працяўнікі, якія прыйшлі на лекцыі. На лекцыях паўтараеце тое, што я вам сёння распавёў. Як бачым, ніякага падману. На гэтым усё. Дыпломы аб паспяховым заканчэнні курсу раздаюцца ў холе».

...Расклейваць свае паперкі Оскар пачаў ужо ў аэрапорце Рэйк'явіку.

ЖАРТЫ

### Як разбагацець падчас крызісу

У амерыканскага багатыра пытаюцца, як ён зарабіў свае мільёны. «Ну, значыцца, дзетачкі, была Вялікая дэпрэсія. І я на свой апошні цэнт купіў апельсін. Я яго вельмі старанна пачысціў і прадаў за два цэнты. У канцы дня ў мяне было ўжо дзесяць цэнтаў. Наступным ранкам на тыя грошы я купіў 10 апельсінаў і г.д. Пры канцы месяца ў мяне было ўжо 5 даляраў. А потым памёр мой цесць і пакінуў мне 2 мільёны даляраў».

### Пасля бурлівае ночы

Хлапец і дзяўчына пасля бурлівае ночы...

Хлопец збіраецца ісці, і раптам каля выхаду ён бачыць фатаграфію мужчыны... ён пытае:

— Любая, хто ён?

— Давай не будзем пра гэта...

— Я ж цябе так люблю, даверся мне, я ўсё зразумею...

— Ну, добра. Гэта я ў мінулым...

### Сынок, не хадзі на дыскатэку

— Сынок, не хадзі кожны вечар на дыскатэку, аглухнеш!

— Дзякуй, мама, я ўжо вячэраў!

## Арлоўскі атрымаў па поўнай у першым раўндзе



У суботу ў каліфарнійскім Анахайме прайшоў галоўны бой году сярод цяжкавагавікоў без правіл. Расіянін Емяльянаў накаўтаваў беларуса Арлоўскага ўжо ў першым раўндзе

Андрэй Арлоўскі (мянушка «Пітбуль») нарадзіўся 2 красавіка 1979 году ў Бабруйску. У 16 гадоў увайшоў у зборную Беларусі па самба, у 19 гадоў заняў 3-е месца на чэмпіянаце свету, а ў 2000 г. заваяваў першае месца. У 1999 г. дэбютаваў у ММА на турніры Mix Fight M-1 у Санкт-Пецярбургу, прайграўшы накаўтам Вячаславу Дацыку. У лістападзе 200 г. дэбютаваў у UFC на турніры UFC 28 — High Stakes, перамог у першым раўндзе Аарона Брынка. У 2005—2006 гг. быў чэмпіёнам гэтай арганізацыі ў цяжкой вазе. У 2008 г. пакінуў UFC.

АНОНС

## Начныя матыліцы

Дзяўчаты, якія пайшлі на панэль. Хто яны, што падштурхнула іх да гэтага? Разбэшчанасць, цяжкія бытавыя ўмовы, а мо адразу тое і другое? У адным Пухавіцкім раёне іх некалькі дзясяткаў.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Чытайце ў наступным нумары «НН».

«НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Галоўны пражытак беларускага селяніна — праца каля няўроднай зямлі і каля лесу, а потым усялякія заробкі ўсё болей у чужой старане. Па ўсёй Расіі можна спаткаць беларуса — худога, з запалымі грудзьмі, з русымі валасамі, у лапцях, у белай світцы і такой жа шапцы-магерцы.

**«Наша Ніва». 22 студзеня 1909**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАННІ

**Дарагі тата Іван!** Віншую цябе з Днём народзінаў. Жадаю ўсяго найлепшага, здароўя. Твой сын Радаслаў

**Віншую Віктара Лецечку** з вяртаннем. Аліна

САБАЧКА

**У г. Баранавічы прыму** за сімвалічны кошт пакаёвага сабачку ў падарунак дзяўчыне. Любоў і пяшчота гарантуюцца! Т.: (033) 698-45-09. Алесь

КНІГІ

**Кніжка** «Яна і Я. Вершы і песні пра каханне» — файны падарунак да Дня Святога Валянціна

ПРАЦА

**Малады беларускамоўны чалавек** шукае сталую працу, здольны да навучання! Магчымы пераклад тэкстаў з рускай на беларускую мову ці нейкія творчыя спецыялізацыі, таксама ёсць здольнасць да напісання артыкулаў і г.д.! Кантактуйце: (044) 754-55-61, (029) 272-75-95 ці праз мыла: aignatchyk@gmail.com, sljaxtic@tut.by! Тэрмінова!!! Загадзя шчыра дзякую! Андрэй!

ЖЫТЛО

**Вазьму на падсяленне** прыстойнага чалавека. Двухпакаёўка. Блізка метро «Парк Чалюскінцаў». Нядорага! Т.: (029) 305 20 91. Сяргей

Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднойленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5660. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.01.2009.
Замова № 464.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12